ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Як прыемна, калі сярод шматлікіх канкурсантаў з розных краін постсавецкай прасторы перамагае беларус — прыгожы, годны выканаўца з цудоўным голасам.

Здаецца, выкладчыку спецкурса па інфарматыцы Міхаілу Далінскаму сёння не патрэбны асаблівыя рэкамендацыі. Калі пачаць пералічваць усе тытулы яго і яго вучняў, не хопіць месца ў газеце.

Феноменам апошніх гадоў стала змяншэнне колькасці выпадкаў язвы страўніка і 12-перснай кішкі. Аднак працягвае заставацца вялікай колькасць хворых з іншымі кіслотазалежнымі паталогіямі. СТАР. 7

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 32°
Віцебск	+28°
Гомель	+28°
Гродна	+ 27°
Магілёў	+26°
Мінск	+28°

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 5.07.2012 г.

Долар ЗША	8320,00 ■
Еўра	10470,00 ■
Рас. руб.	258,50 ▲
Укр. грыўня	1028,94 ▼

АФІЦЫЙНА

Парушэнняў паветранай прасторы Беларусі за мінулыя суткі не было. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў Міністэрстве абароны Беларусі.

Тым самым у міністэрстве абверглі інфармацыю, якая з'явілася ў некаторых СМІ, што быццам бы ўчора раніцай над Мінскам лятаў неўстаноўлены самалёт пад кіраваннем грамадзян Швецыі.

«За апошнія суткі парушэння дзяржаўнай граніцы Беларусі ў паветранай прасторы не было. Усе маршруты пералётаў паветраных суднаў адсочаны. Дзяжурнымі сіламі па проціпаветранай абароне праведзена больш як 1 тыс. паветраных суднаў», — адзначылі ў Мінабароны.

У ведамстве падкрэслілі, што органы кіравання паветраным рухам вядуць пастаянны кантроль за паветранай прасторай Беларусі.

ISSN 1990 - 763X

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

5 ЛІПЕНЯ 2012 г. ЧАЦВЕР № 127 (27242) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЖЫВАЯ ВАДА ЛАГОЙСКІХ ПАГОРКАЎ

Фота Анатоля КЛЕЩЧУКА.

ХТО наведвае сялянскую фермерскую гаспадарку Сяргея ШТАЦКАГА ў вёсцы Саўдзеневічы Лагойскага раёна, не праміне, каб не пачаставацца вадой са студні, выкапанай у гліне. І зрабіць фота на памяць. Вада смачная і чыстая, як сляза. Над студняй гаспадар узвёў зруб арыгінальнай формы з асіны.

«Тут вялікія запасы чырвонай гліны, і мне давялося капаць амаль 15 метраў, пакуль не дабраўся да воднай артэрыі. Паспытаўшы вадзіцы, зразумеў: праца мая была недарэмнай.

На фота: фермер Сяргей Штацкі з сынам Сяргеем каля свайго калодзежа.

БЕЛАРУСЬ ВОЗЬМЕ ЎДЗЕЛ У ПАРЛАМЕНЦКАЙ АСАМБЛЕІ АБСЕ

Парламенцкая дэлегацыя Рэспублікі Беларусь на чале з намеснікам Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Віктарам ГУМІНСКІМ возьме ўдзел у 21-й штогадовай сесіі Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (ПА АБСЕ), якая адбудзецца ў Манака з 5 па 9 ліпеня.

Чакаецца, што ў працы сесіі будуць удзельнічаць звыш 250 парламентарыяў з больш чым 50 краін, паведамляе прэс-служба Палаты прадстаўнікоў. Яны абмяркуюць тры рэзалюцыі агульных камітэтаў ПА АБСЕ і 28 дадатковых рэзалюцый, якія датычацца ўмацавання бяспекі ў Еўропе, барацьбы з гандлем людзьмі, супрацьдзеяння расізму і ксенафобіі, экстрэмізму і радыкалізацыі, назірання за выбарамі і харчовай бяспекі.

На сесіі ПА АБСЕ будзе абмеркаваны падрыхтаваны беларускім бокам праект рэзалюцыі «Садзейнічанне выкарыстанню новых і аднаўляльных крыніц энергіі», які атрымаў падтрымку 41 парламентарыя з 17 краін.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Пасол Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла:

«БЕЛАРУСЬ ПАБУДУЕ Ў ВЕНЕСУЭЛЕ КАСМАДРОМ І 20 ТЫС. КВАТЭР...»

РОЗНІЦА ў адзін дзень у календары і больш за стагоддзе ў гісторыі — паміж падзеямі, якія сталі святкавацца ў якасці Дня Незалежнасці ў Беларусі і Венесуэле. Але цяпер многія схільны бачыць не проста супадзенне, а сімвал у тым, што два народы на супрацьлеглых баках зямнога шара адзначаюць ідэнтычнае па сэнсе свята амаль адначасова.

Венесуэла сёння згадвае падзеі 5 ліпеня 1811 года, калі на абраным Устаноўчым Кангрэсе ў Каракасе было ўрачыста абвешчана пра незалежнасць дзяржавы ад каланіяльнай Іспаніі. З таго часу і да сённяшняга дня барацьба народа Венесуэлы і іншых краін Лацінскай Амерыкі і Карыбскага басейна за поўную незалежнасць працягваецца — на іншых франтах і з новымі саюзнікамі. СТАР. 2

Да 34 градусаў цяпла будзе ў Беларусі 5 ліпеня, паведамілі ў Рэспубліканскім гідраметэацэнтры. Кароткачасовыя дажджы пройдуць толькі па паўночным захадзе рэспублікі, месцамі прагрымяць навальніцы.

А ЯК ВЫ РАТУЕЦЕСЯ АД СПЯКОТЫ?

Антаніна ЗІНАВЕНКА, галоўны рэдактар святочнага рэсурсу povod.tut.by:

— Радавацца трэба, бо гэта ж лета! Увогуле ўспрыняцце розных з'яў у нашым жыцці, а тым больш надвор'я, залежыць ад бадзёрасці і пазітыўнага стаўлення да жыцця. Камусьці і дождж — бяда, а для кагосьці — добры фон, каб пасядзець пад пледам, пачытаць сваю любімую кнігу альбо выпіць гарбаты з сябрамі. Усё залежыць ад нашага ўспрыняцця жыццёвых сітуацый.

Як ратуюся ад спякоты? Імкнуся апранаць вопратку з натуральнай тканіны. Па магчымасці, больш вольную. П'ю чыстую ваду. А калі даводзіцца ў пік спёкі знаходзіцца дзесьці на вуліцы, я, як і любы іншы чалавек, хаваюся ў цяньку, махаю ўсялякімі спадручнымі паперкамі і папкамі, нібы веерам. У любой сітуацыі галоўнае — выдатны настрой, і тады любая спёка нам хоць бы што! Чаго ўсім чытачам «Звязды» і жадаю!

Юрый ЖЫХАРАЎ, начальнік АДАІ Фрунзенскага раёна г. Мінска:

— Мне не вельмі падабаецца, калі гарачае надвор'е. Я люблю і не спёку, і не халоднае надвор'е, а нешта сярэдняе між гэтым. Якім чынам змагаюся? Ну, калі «кіпіць» ужо ўсё, магу з'есці марозіва, выпіць зялёнай гарбаты, якая вельмі дапамагае. Ратуе кандыцыянер у фортцы і цянёк. Добра, што і ў аўто ёсць кандыцыянер. У спёку лічу за лепшае як мага раней прыехаць на працу, засядзецца за ёй і вяртацца дадому, калі ўжо не смаліць.

Алена КРАМАРЭНКА, медсястра 6-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі (г. Мінск):

— У спёку заўжды стараюся піць мінеральную ці трохі падсоленую ваду. Падчас гарачага надвор'я арганізм з потам губляе вялікую колькасць солі, а таму салявы баланс заўжды неабходна папаўняць. Безумоўна, трэба пазбягаць душных памяшканняў і прамых сонечных промняў. І ў такім выпадку спёка не павінна стаць для вас прычынай псіхалагічнага дыскамфорту.

Падрыхтаваў Тарас ШЧЫРЫ.

КАРОТКА

Дзяржаўны доўг Беларусі на 1 чэрвеня 2012 года склаў Br115,2 трлн і зменшыўся ў параўнанні з пачаткам 2012 года на Br1,2 трлн, або на 1 працэнт, паведамілі ў Міністэрстве фінансаў.

У Беларусі неабходна стварыць турыстычны маршрут па аб'ектах Геадэзічнай Дугі Струвэ. Аб такой магчымасці ішла размова на сустрэчы каардынацыйнага камітэта Дугі Струвэ ў Ашмянах. Турыстычны маршрут можа ўключаць наведванне пунктаў Дугі Струвэ, а таксама іншыя выдатныя мясціны.

У сталічным парку імя Горкага ў Дзень Незалежнасці нарад з пажарна-прафілактычнай часці №37 Першамайскага раёна ўбачыў двух хлопчыкаў 2004 і 2002 гадоў нараджэння. Дзеці паводзілі сябе неспакойна і знаходзіліся без бацькоў. Работнікі МНС праз гучную сувязь інфармацыйнай службы парка апавясцілі пра «знаходку» бацькоў і потым перадалі апошнім іх дзетак.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ УГА ЧАВЕСА З ДНЁМ АБВЯШЧЭННЯ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ ВЕНЕСУЭЛЫ

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста павіншаваў Прэзідэнта Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла Уга Чавеса і народ гэтай краіны з нацыянальным святам — Днём абвяшчэння незалежнасці Венесуэлы.

«Беларусь надае вялікае значэнне ўзаемавыгаднаму супрацоўніцтву з Венесуэлай. За 15 гадоў з моманту ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж нашымі дзяржавамі дасягнуты вялікі прагрэс у канструктыўных беларуска-венесуэльскіх сувязях», — сказана ў віншаванні.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што абодва бакі на высокім узроўні падтрымліваюць цесныя кантакты, заснаваныя на шчырым даверы. Краіны паспяхова супрацоўнічаюць у рамках ААН і іншых міжнародных структур. Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што і ў будучыні плённае партнёрства паміж Беларуссю і Венесуэлай у палітычнай, гандлёва-эканамічнай, культурнай і іншых сферах будзе ўмацоўвацца і паглыбляцца.

ПАДЗЯКА ПРЭЗІДЭНТА АБ'ЯЎЛЕНА ВЫПУСКНІКАМ ВАЕННЫХ ВНУ

Падзяка Прэзідэнта Беларусі за выдатныя поспехі ў вучобе і ўзорнае выкананне воінскага абавязку аб'яўлена 19 выпускнікам устаноў вышэйшай адукацыі. Адпаведнае распараджэнне падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка.

Сярод удастоеных Падзякі Прэзідэнта — ваеннаслужачыя Узброеных Сіл, органаў дзяржаўнай бяспекі, супрацоўнікі органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях.

Аляксандр Лукашэнка таксама падпісаў распараджэнне, у адпаведнасці з якім за выдатныя поспехі ў вучобе і ўзорнае выкананне воінскага абавязку Падзяка Прэзідэнта Беларусі аб'яўлена ваеннаслужачаму Узброеных Сіл Казахстана палкоўніку Талгату Ісмаілаву, выпускніку факультэта Генеральнага штаба Узброеных Сіл Ваеннай акадэміі Беларусі.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

МАРЫ САПРАЎДЫ ЗДЗЯЙСНЯЮЦЦА

Карэспандэнт «Звязды» Уладзімір Здановіч разам з вядомымі айчыннымі спартсменамі прыняў удзел у лёгкаатлетычным прабегу «Табе, Беларусь, прысвячаецца!».

Біятланістка Дар'я Домрачава, баскетбаліст Ягор Мешчаракоў, хакеіст Уладзімір Дзянісаў, футбаліст Сяргей Гурэнка, хакеіст Віктар Касцючонак... Выйсці на дыстанцыю вядомых суайчыннікаў і сотні простых аматараў бегу падштурхнуў далёка не банальны інтарэс.

— Бег сам па сабе аб'ядноўвае. І нам хацелася, каб прабег дапамог балельшчыкам пакантактаваць з кумірамі, сфатаграфацца, прабегчы разам з імі дыстанцыю, — кажа **Сяргей ШЧУРКО, журналіст, каардынатар праекта.**

Акрамя таго, забег — частка акцыі «Мары здзяйсняюцца», мэта якой — фінансавая дапамога лячэнню дзяцей у Бараўлянскім анкалагічным цэнтры. Ахвотны набываў майку за 70 тыс. рублёў і адразу рабіўся ўдзельнікам праекта.

— Быў складзены спіс з 9 дзяцей, якім неабходна дапамога. Мы сабралі прыкладна 4,8 млн рублёў, але будзем яшчэ дадаваць грошы. А на наступным тыдні збіраемся перадаць усё неабходнае, што папрасілі дзеці, — дадаў Сяргей Шчурко.

Тарас ШЧЫРЫ.

«БЕЛАРУСЬ ПАБУДУЕ Ў ВЕНЕСУЭЛЕ КАСМАДРОМ І 20 ТЫС. КВАТЭР...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Як адзначыў на прэс-канферэнцыі, прысвечанай Дню Незалежнасці Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол гэтай краіны ў Беларусі Амерыка Дыяс НУНЬЕС, мы разлічваем на падтрымку народа і кіраўніцтва Беларусі ў імкненні ўрада Уга Чавеса задаволіць асноўныя запатрабаванні нашых людзей у жыллі, працы, харчаванні, здароўі і адукацыі шляхам сумеснай работы, якая праводзіцца ў рамках шматлікіх пагадненняў і дамоў, заключаных паміж двума ўрадамі, і якая сёння ўжо прыносіць адчувальны і канкрэтны плён. — Сяброўства і сацыяльны прагрэс у мэтах дасягнення поўнай незалежнасці абедзвюх краін — вось наш дэвіз у адносінах з Рэспублікай Беларусь, якія развіваюцца ў нармальным рэжыме з відавочным паскарэннем, — сказаў ён.

Яшчэ 6 гадоў таму паміж Беларуссю і Венесуэлай не было амаль ніякіх адносін, нагадаў пасол. Існавала толькі адно пагадненне на пастаўку калійных угнаенняў коштам $6 млн. Сёння тавараабарот паміж нашымі краінамі складае $1,5 млрд — лічбы, якія кажуць самі за сябе.

Вельмі значным для развіцця не толькі двухбаковых адносін быў нядаўні візіт Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у Венесуэлу. Сярод новых кірункаў у супрацоўніцтве стала дамова пра рэканструкцыю вайскова-паветранай базы, у выніку якой у краіне павінен з'явіцца другі па значнасці аэрапорт. Акрамя таго, Беларусь разам з КНР будзе ўдзельнічаць у будаўніцтве касмадрома для запуску спадарожнікаў у навуковых і даследчых мэтах. Дасягнута дамова пра будаўніцтва 20 тысяч кватэр у двух раёнах сталіцы Венесуэлы і газіфікацыю гэтых раёнаў, будаўніцтва 4 новых аграгарадкоў. Сярод новых кірункаў таксама — наладжванне зборкі аўтобусаў, вытворчасць будаўнічых панэляў.

У сваю чаргу, Венесуэла пастаўляе ў Беларусь неабходную нафту, калі гэта патрабуецца, без выстаўлення папярэдніх умоў і якога-небудзь ціску, падкрэсліў спадар Нуньес.

— Першапачаткова адносіны паміж Беларуссю і Венесуэлай будаваліся, зыходзячы з прынцыпу ўзаемадапаўняльнасці, — адказаў пасол на пытанне журналіста «Звязды» пра перспектыву турыстычных сувязяў паміж краінамі. — Гэта адбываецца ва ўсіх сферах, у тым ліку і ў турызме. У нас ёсць мора, горы, экзатычная прырода, лета круглы год і ўнікальная рыбалка! Не хапае толькі больш зручных транспартных зносін, для якіх неабходна дамова паміж нацыянальнымі авіякампаніямі.

На працягу бліжэйшых 3 гадоў многіх здзівіць удзел Беларусі ў самых розных праектах у Венесуэле, заўважыў пасол. «Шэсць гадоў таму я казаў, што Венесуэла стане для Беларусі акном у Лацінскую Амерыку. Сёння гэта адбылося. Цяпер Беларусь абмяркоўвае праекты з іншымі краінамі. Будучае — за поўднем».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

P.S. ***6 ліпеня ў Малой зале імя Шырмы Беларускай дзяржаўнай філармоніі (Мінск, пр. Незалежнасці, 50) у гонар Дня Незалежнасці Баліварыянскай Рэспублікі Венесуэла выступіць ансамбль лацінаамерыканскай фальклорнай музыкі з Венесуэлы «Тэраканта». Пачатак а 18 гадзіне, уваход свабодны.***

ЯГАДНЫЯ МЕСЦЫ — ПАД ПІЛЬНУЮ ЎВАГУ

З пачатку сезона нарыхтоўкі лясных ягад дзяржаўная лясная ахова Мінлясгаса павялічыла колькасць рэйдавых мерапрыемстваў, накіраваных на кантроль захавання грамадзянамі правілаў нарыхтоўкі дзікарослых ягад і грыбоў.

Увогуле з пачатку сезона нарыхтоўкі другасных лясных рэсурсаў у выніку рэйдавых мерапрыемстваў дзяржаўнай лясной аховы да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнута 265 чалавек — за парушэнне правілаў нарыхтоўкі, збору ці закупкі грыбоў, іншых дзікарослых раслін ці іх частак. За парушэнне правілаў проціпажарнай адказнасці ў лясах прыцягнута да адказнасці 215 чалавек, за распальванне вогнішчаў у забароненых месцах ляснога фонду — 113, за засмечванне лясоў — больш за 1,5 тысячы. Міністэрства лясной гаспадаркі заклікае грамадзян пры нарыхтоўцы лясных ягад і грыбоў прытрымлівацца вышэйназваных правілаў.

ЗА РЫСЬ І ГУСЕЙ ЗАМОВІЛІ СЛОВА

На падставе атрыманых прапаноў, што паступілі ад грамадзян і юрыдычных асоб, і ў адпаведнасці з даручэннямі кіраўніка дзяржавы і распараджэннем прэм'ер-міністра, Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя выступіла з ініцыятывай выключыць з пераліку паляўнічых жывёл шэраг пазіцый.

Выключыць са спісу паляўнічых жывёл прапануецца рысь, гусь шэрую, шылахвостку, качку-свіязь, ворана чорнага, грака, канюка, мышалова балотнага, ястраба-цецеравятніка. Таксама прапануецца скараціць тэрміны веснавога палявання на птушку. У прыватнасці, на глушца і цецерука — да 20 красавіка. Усе прапановы накіраваны ў Міністэрства лясной гаспадаркі для іх разгляду на пасяджэнні міжведамаснага савета па паляўнічай гаспадарцы.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Тарыфы

ЗАМЕНА ТЭЛЕФОННАГА НУМАРА ПАДАРАЖЭ

З 9 ліпеня кампанія «Белтэлекам» павялічвае тарыфы (не больш як на 20% ад ранейшага кошту) на некаторыя паслугі электрасувязі. У прыватнасці, павышэнне закране даведачна-інфармацыйныя паслугі, дадатковыя паслугі сетак перадачы даных, ремонт абаненцкіх устройстваў, паслугі відэаканферэнц-сувязі, праваднога вяшчання, дадатковыя паслугі, якія аказваюцца на пунктах калектыўнага карыстання «Белтэлекам», асобныя пазіцыі па паслугах хостынгу, тарыфы на паслугі электрасувязі агульнага карыстання, якія не рэгулююцца Міністэрствам эканомікі (паслугі тэлеграфнай сувязі, дадатковыя паслугі мясцовай тэлефоннай сувязі, дадатковыя віды паслуг, што прадастаўляюцца электроннымі АТС, замену нумара па просьбе абанента, прадастаўленне ў карыстанне прамых сувязяў і каналаў доступу, некаторыя пазіцыі эксплуатацыйна-тэхнічнага абслугоўвання сродкаў электрасувязі).

Павышэнне тарыфаў на вышэйзгаданыя паслугі звязана з выхадам на іх бясстратнасць.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Падрабязнасці

НЕ ЗНАЙШЛІ АГУЛЬНАЙ МОВЫ

Спікер Рады Украіны сышоў у адстаўку, спецназ выкарыстоўвае спецсродкі...

Прыняцце Вярхоўнай Радай Украіны ў другім, канчатковым, чытанні закона, які прадугледжвае значнае пашырэнне сфер прымянення рускай мовы, прывяло да рэзкага абвастрэння становішча ў краіне. У знак пратэсту супраць вынікаў галасавання па законе «Аб асновах дзяржаўнай моўнай палітыкі» падалі ў адстаўку спікер украінскага парламента Уладзімір Літвін і яго намеснік Мікалай Таменка. Між тым, у цэнтры Кіева з аўторка працягваецца супрацьстаянне супрацоўнікаў праваахоўных органаў і тых, хто пратэстуе супраць новага закона.

У сераду ў сувязі з напружаным становішчам прэзідэнт Украіны Віктар Януковіч сустракаўся з кіраўніцтвам Рады і лідарамі фракцый, паведамляюць інфармагенцтвы. Па выніках гутаркі ён не выключыў, што, калі не ўдасца стабілізаваць працу парламента, «трэба будзе пераходзіць да працэдуры датэрміновых парламенцкіх выбараў».

Паводле звестак украінскіх СМІ, старшыня ўкраінскага парламента Уладзімір Літвін вырашыў пакінуць свой пост, таму што закон аб мове быў прыняты ў абход рэгламенту. На сустрэчы з лідарамі аб'яднанай апазіцыі Літвін заявіў, што «ні пры якіх абставінах» не падпіша прыняты ў аўторак «моўны» закон, паведамляе прэс-служба партыі «Фронт перамен». Перад галасаваннем напярэдадні Літвін пакінуў залу, а працэдурай кіраваў першы віцэ-спікер, камуніст Адам Мартынюк.

Становішча на вуліцах Кіева працягвае заставацца напружаным. Байцы спецпадраздзялення «Беркут», якія прыбылі раніцай да Украінскага дома на Еўрапейскай плошчы, сілай адцяснулі пратэстуючых супраць прыняцця закона ад сцен будынка. Відавочцы паведамілі журналістам, што супраць дэманстрантаў быў ужыты слёзатачывы газ. У байцоў праціўнікі новага закона кідаюць бутэлькі і іншыя падручныя прадметы. На плошчы перад будынкам дзяжураць некалькі машын хуткай дапамогі. Як сцвярджае апазіцыя, у аблозе Украінскага дома ўдзельнічаюць каля 5 тысяч байцоў «Беркута».

У міліцыі прызналі, што сілавікі выкарысталі слёзатачывы газ, але адзначылі, што гэты спецсродак падчас акцыі пратэсту выкарысталі і ўдзельнікі мітынгу.

Бойка ў аўторак адбылася і ў самой Радзе падчас прыняцця скандальнага закона. Галасаванне адбылося нечакана для апазіцыі. Яшчэ ў панядзелак спікер Уладзімір Літвін абяцаў, што закон не будзе разглядацца ў бліжэйшыя дні з-за недапрацовак і палітычнай напружанасці ў сувязі з ім у грамадстве.

Аднак у аўторак Партыя рэгіёнаў узяла ў кальцо галоўную трыбуну ў зале пасяджэння, пасля чаго віцэ-спікер Адам Мартынюк вынес на галасаванне некалькі законапраектаў, у тым ліку і «моўны» закон.

Пачуўшы гэта, дэпутаты фракцыі «БЮЦ-Бацькаўшчына» і «Наша Украіна — Народная самаабарона» адразу ж рынуліся ў прэзідыум, каб перашкодзіць Мартынюку аб'явіць галасаванне па гэтым пытанні. У зале пасяджэнняў успыхнула бойка. Паводле звестак украінскіх СМІ, падчас бойкі народнаму дэпутату апазіцыйнай фракцыі Андрэю Парубію зламалі рэбры.

Новы закон, які выклікаў столькі спрэчак, устанаўлівае, што дзяржаўнай мовай у краіне з'яўляецца ўкраінская. Акрамя таго, у законе прадугледжваецца, што ў кантэксце еўрапейскіх рэгіянальных моў або моў меншасцяў да рэгіянальных моў або моў меншасцяў Украіны аднесены наступныя: руская, беларуская, балгарская, армянская, гагаузская, ідыш, крымскататарская, малдаўская, нямецкая, польская, румынская, славацкая, венгерская і інш.

Да кожнай з гэтых моў прымяняюцца меры, накіраваныя на выкарыстанне рэгіянальных моў і моў меншасцяў, пры ўмове калі колькасць асоб-носьбітаў гэтай мовы, якія пражываюць на тэрыторыі, на якой распаўсюджана гэтая мова, складае 10 і больш працэнтаў ад колькасці насельніцтва. Закон прадугледжвае, што па рашэнні мясцовага савета, у асобных выпадках, з улікам канкрэтнай сітуацыі, можа прымяняцца мова нацыянальных меншасцяў, калі рэгіянальная моўная група складае менш за 10% адпаведнай тэрыторыі.

Украінская апазіцыя заяўляе пра неабходнасць правядзення ў краіне датэрміновых парламенцкіх і прэзідэнцкіх выбараў. «Ва Украіне павінны адбыцца датэрміновыя парламенцкія і прэзідэнцкія выбары», — сказаў кіраўнік савета Аб'яднанай апазіцыі «Бацькаўшчына», лідар партыі «Фронт перамен» Арсеній Яцанюк на брыфінгу ў сераду. «Народ Украіны не выбіраў Януковіча на той аб'ём паўнамоцтваў, якімі ён зараз карыстаецца. Таму, калі прэзідэнт знойдзе ў сябе сілу і мужнасць прызнаць, што ён прывёў Украіну да палітычнага крызісу, да палітычнай ізаляцыі, да таго, што Украіна стала буфернай зонай паміж нашымі расійскімі партнёрамі і Еўрапейскім саюзам, ён павінен аб'явіць аб правядзенні датэрміновых парламенцкіх і прэзідэнцкіх выбараў», — падкрэсліў Яцанюк

■

Антон ДАЎГАВЕЧНЫ:

«ВАЛЮТНЫ КРЫЗІС 2011 ГОДА НЕ ПЕРАЙШОЎ У ЭКАНАМІЧНЫ»

У Беларусі па выніках студзеня—мая гэтага года захоўваецца станоўчая дынаміка тэмпаў эканамічнага развіцця. Пра гэта журналістам на брыфінгу заявіў Антон ДАЎГАВЕЧНЫ, начальнік галоўнага ўпраўлення макраэканамічнага аналізу і прагназавання Міністэрства эканомікі. Па яго словах, тэмп росту ВУП склаў 103,1% у параўнанні з аналагічным перыядам 2011 года.

Аснову эканамічнага росту склала прамысловасць: фактычна з гэтых трох працэнтаў, на якія вырас ВУП, два працэнты былі сфарміраваны менавіта за кошт прамысловасці. Галоўным чынам такі вынік атрымаўся дзякуючы паспехам у нафтаперапрацоўчай галіне і хімічнай прамысловасці. Але нават без уліку гэтых галін, як адзначыў Антон Даўгавечны, тэмп росту ў прамысловасці быў станоўчым. Пэўны ўклад у рост ВУП далі таксама гандаль (0,8%), транспарт і сувязь (0,7%), сельская гаспадарка (0,2%). А вось будаўнічая галіна мела адмоўны вынік у памеры мінус 1,3%. Як патлумачыў начальнік галоўнага ўпраўлення макраэканамічнага аналізу і прагназавання, да скарачэння аб'ёмаў будаўніцтва прывяло прымяненне шэрагу захадаў па сцісканні ўнутранага попыту.

Сітуацыю з запасамі гатовай прадукцыі можна ахарактарызаваць як адносна стабільную: на 1 чэрвеня 2012 года ўзровень запасаў гатовай прадукцыі складаў каля 20 трыльёнаў рублёў, або трохі болей за 51% за сярэднямесячны аб'ём вытворчасці. Антон Пятровіч кажа, што гэта істотна ніжэй за сярэдні ўзровень запасаў за апошнія 10 гадоў. Такое скарачэнне запасаў адбылося дзякуючы зніжэнню рэальнага абменнага курса і, адпаведна, павышэнню цэнавой канкурэнтаздольнасці беларускай прадукцыі.

— У цэлым, калі паглядзець на галіновую дынаміку, то можна гаварыць пра тое, што валютны крызіс 2011 года не перайшоў у эканамічны: гэта значыць, што рэцэсіі ў Беларусі не назіраецца, а ў нас ёсць пазітыўная дынаміка росту, — сказаў Антон Даўгавечны. — Гэта пацвярджае колькасць зарэгістраваных юрыдычных асоб: яна павялічылася на 4,5% у параўнанні з 1 чэрвеня мінулага года і больш чым на 3% у параўнанні з пачаткам года. І ўвесь прырост — гэта недзяржаўны сектар, што кажа пра аднаўленне бізнэс-актыўнасці ў Беларусі.

Антон Пятровіч таксама расказаў, што і на наступны год плануецца рост ВУП:

— Натуральны ўзровень росту на наступны год — каля 105-106%. Мы разумеем, што гэтыя паказчыкі не дазваляюць выйсці на лічбы, запісаныя ў асноўных напрамках развіцця на пяцігодку. Урад спрабуе знайсці і выпрацаваць захады, якія забяспечаць больш высокія тэмпы росту ВУП. Але асноўная праблема ў тым, што нам трэба забяспечыць гэты рост, не выходзячы за межы збалансаванасці — эканоміка павінна развівацца збалансавана, каб не было паўтору негатыўных падзей 2011 года.

Адным з самых пазітыўных вынікаў 2012 года Антон Даўгавечны назваў паляпшэнне стану знешняга сектара Рэспублікі Беларусь: сальда бягучага рахунку па выніках 4 месяцаў з'яўляецца станоўчым. Гэта, на яго погляд, сведчыць пра знешнюю ўстойлівасць і пра тое, што ў перспектыве ў краіны не будзе праблем з абслугоўваннем знешняга доўгу — вядома, пры ўмове, што такая дынаміка будзе захоўвацца.

Вядзенне больш жорсткай грашова-крэдытнай і падаткова-бюджэтнай палітыкі аказала стрымальны ўплыў на інвестыцыі ў асноўны капітал — новага абсталявання беларускія прадпрыемствы сталі закупляць значна менш. Як лічыць Антон Даўгавечны, гэта аб'ектыўная тэндэнцыя, бо вельмі высокія стаўкі на крэдытныя рэсурсы. Але з іншага боку, гэта дазволіла стрымаць рост інфляцыі:

— Тая інфляцыя, якую мы бачым цяпер (індэкс спажывецкіх цэн за пяць месяцаў года вырас на 8,5%), дазваляе думаць, што мы гадавы паказчык па інфляцыі ў памеры 20-22% вытрымаем. Чаму працягваюцца інфляцыйныя працэсы? Гэта звязана з іх інерцыйнасцю, з пакрыццём дэвальвацыйнага патэнцыялу. Але мы чакаем, што дынаміка, якая існуе зараз (каля 1,5% у месяц), працягнецца да канца года. Натуральна, рост спажывецкіх цэн можа быць трохі вышэйшым за кошт павышэння ўзроўню вяртання насельніцтвам выдаткаў за паслугі ЖКГ, але мы ставімся да гэтага дастаткова асцярожна, бо з іншага боку, ёсць і сацыяльныя абавязкі дзяржавы перад насельніцтвам. Таму тут будзе падтрымлівацца баланс паміж ростам зарплаты і павышэннем аплаты за жыллёва-камунальныя паслугі.

Што тычыцца зарплаты ў Беларусі, то сёння рэальныя грашовыя даходы насельніцтва амаль дасягнулі ўзроўню мінулага года. Тут Антон Даўгавечны бачыць пазітыўную дынаміку і мяркуе, што далейшы рост зарплаты не будзе аказваць негатыўнага ўплыву на збалансаванасць эканомікі.

— Сапраўды, рост даходаў насельніцтва павінен аказваць ціск на цэны на ўнутраным спажывецкім рынку — гэта эканамічная тэорыя. Урад гэта разумее, таму мы выпрацоўваем захады для стрымання інфляцыі. Яны будуць засяроджаны і ў частцы грашова-крэдытнай палітыкі: будуць захоўвацца станоўчыя працэнтныя стаўкі, каб павышэнне даходаў насельніцтва можна было звязваць у дэпазіты. Яшчэ адзін з фактараў, які будзе стрымліваць ціск на спажывецкі рынак — далейшае павышэнне цэн на жыллёва-камунальныя паслугі. Індэкс спажывецкіх цэн вырасце, але гэта не будзе аказваць негатыўнага ўплыву на ўзровень канкурэнтаздольнасці беларускіх таваравытворцаў.

Павел БЕРАСНЕЎ.

ЦІ НАДОЎГА ЗНІК З ПРОДАЖУ АЙЧЫННЫ КАРП?

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

Такім было чарговае пытанне, што паступіла на рэдакцыйную «гарачую» лінію ад мінчанкі. Паводле яе слоў, у іх сям'і заведзена хаця б раз у месяц набываць свежую рыбу, найперш карпа. Зазірнула жанчына ў вядомы сталічны магазін «Акіян», а там — пустыя-сухія акварыумы. У вітрынах толькі адна перамарожаная рыба замежнага паходжання. А дзе ж карпы, што плавалі тут яшчэ нядаўна? Пайшла на Камароўскі рынак, дзе заўсёды традыцыйна гандлююць сваё прадукцыяй адразу некалькі рыбгасаў, — тая ж карціна. Няма ў продажы жывога карпа і ў іншых гандлёвых прадпрыемствах.

Па каментарыі мы звярнуліся ў дзяржаўнае вытворчае аб'яднанне «Белмеліявадгас» — структурнае падраздзяленне дэпартамента па меліярацыі і воднай гаспадарцы Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. У прыватнасці, пагутарылі з намеснікам начальніка аддзела па забеспячэнні і збыце вышэйназванага аб'яднання Валерыем Багданоўскім.

— Практычна ўсе рыбгасы краіны нядаўна закончылі рэалізацыю «ўраджаю» мінулага года. Трэба заўважыць, што вытворчасць рыбы ў нашай краіне ў сувязі з кліматычнымі ўмовамі носіць сезонны характар. Доўга трымаць вырашчаных яшчэ летась карпаў нявыгадна: яны пачынаюць худзець. Тэхналогіі вырошчвання ў закрытых памяшканнях, якія выкарыстоўваюцца на Захадзе, дастаткова дарагія і падыходзяць найперш для вытворчасці каштоўных відаў рыбы — фарэлі, асятровых, — расказаў Валерый Яўгенавіч. — Зараз у рыбгасах ідзе актыўны адкорм рыбы сёлетняга «ўраджаю». Адкорм доўжыцца два месяцы — чэрвень і ліпень. Рэалізоўваць рыбу, якая не набрала вагі, немэтазгодна і эканамічна нявыгадна. Масавы яе вылаў традыцыйна распачынаецца з сярэдзіны жніўня. Аднак жывая рыба з'явіцца ў продажы ўжо ў бліжэйшыя дні, калі пройдуць селектыўныя вылавы. Што гэта такое? Пры масавым аблове сажалак вада з іх цалкам спускаецца і вылаўленая рыба змяшчаецца ў спецыяльныя садкі. Цяпер такі спосаб не падыходзіць, таму што працягваецца адкорм карпа. Таму пад кармушкамі ставяцца спецыяльныя пасткі, куды і трапляе рыба. Дробная адпускаецца назад, буйнейшыя экзэмпляры — рыбіны вагой ад 600-800 грамаў — якраз і пойдуць у гандаль. Дарэчы, пры селектыўным вылаве вывучаецца, як ідзе набор вагі рыбай, вызначаюцца сажалкі, дзе ў сярэдзіне жніўня распачнецца масавы аблоў.

Карыстаючыся выпадкам, мы пацікавіліся ў Валерыя Багданоўскага, якімі будуць цэны на прадукцыю сёлетняга «ўраджаю», наколькі яны могуць змяніцца.

— У сабекошце вытворчасці рыбы каля 60 працэнтаў складае кошт кармоў. У параўнанні з мінулым разам яны падаражэлі ў два-тры разы. Натуральна, па аб'ектыўных прычынах, у тым ліку найперш па вышэйназванай, рыба новага «ўраджаю» некалькі павялічыцца ў кошце, — адказаў Валерый Яўгенавіч. — Вядома, не ў два-тры разы. Мы цудоўна памятаем пра сацыяльную значнасць тавару. Апроч таго, самі зацікаўлены, каб цэны былі даступнымі і прадукцыя знаходзіла свайго пакупніка. Падаражанне складзе, думаецца, каля 20 працэнтаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Ведай нашых!

МАЛАДЫЯ... І НАЙЛЕПШЫЯ!

Лепшых кіраўнікоў аддзяленняў паштовай сувязі (АПС) вызначалі днямі на вытворчасці «Мінская пошта».

Сярод крытэрыяў адбору ўдзельнікаў конкурсу прафесійнага майстэрства былі і працоўны досвед, і стабільныя эканамічныя паказчыкі, і адсутнасць браку, скаргаў з боку кліентаў.

Прэтэндэнтак на званне лепшых чакалі сур'ёзныя выпрабаванні. На першым з іх яны дэманстравалі веданне справы. Для гэтага трэба было аператыўна прыняць і апрацаваць тэлеграму віду «завераная», аформіць лісток непрацаздольнасці і скласці табель уліку працоўнага часу, пракантраляваць правільнасць запаўнення кнігі касіра, прыняць грашовыя пераводы...

Лепш за ўсіх гэта атрымалася ў Ірыны Мікалаеўны Антонавай, начальніка 47-га аддзялення паштовай сувязі.

Другім этапам конкурсу стала прэзентацыя дамашняга задання, прысвечанага Году кнігі. Кіраўнікі аддзялення сувязі 101 зрабілі кнігу з дрэва, начальнік 36-га аддзялення спякла торт-кнігу «Белпошта», кіраўнік 47-га — прапанавала журы і ўдзельнікам конкурсу адгадаць загадкі на кніжную тэматыку. Але самым эфектным выступленнем журы палічыла гумарыстычную прэзентацыю Вольгі Пятроўны Новік, намесніка начальніка 45-га аддзялення паштовай сувязі.

На трэцім этапе канкурсанткі дэманстравалі веданне тэорыі: адказвалі на сто тэставых пытанняў. Найбольшую колькасць балаў тут набрала Валянціна Аляксандраўна Мароз, якая кіруе АПС-8. Яна ж стала пераможніцай у віктарыне.

Такім вось чынам журы пад кіраўніцтвам начальніка вытворчасці «Мінская пошта» Алены Уладзіміраўны Трубач і вызначыла лепшых з лепшых. Абсалютнай пераможніцай конкурсу прафесійнага майстэрства, набраўшы ў суме 110,5 бала, стала начальнік 7-га паштовага аддзялення сувязі Наталля Анатольеўна Камякова. Другое месца — у намесніцы начальніка 37-га аддзялення Марыны Сяргееўны Бладыкі, трэцяе — у Ірыны Аляксандраўны Тамілінай (начальніка АПС-12). Менавіта гэтая тройка будзе адстойваць гонар сталічных паштавікоў на рэспубліканскім конкурсе прафесійнага майстэрства.

Усім канкурсанткам былі ўручаны каштоўныя прызы, сувеніры і кветкі.

Валянціна ДОЎНАР

■

Пераможцы конкурсу прафесійнага майстэрства І.А ТАМІЛІНА (АПС-12), М.С. БЛАДЫКА (АПС-37) і Н.А. КАМЯКОВА (АПС-7) з кіраўнікамі журы — начальнікам вытворчасці «Мінская пошта» А.У. ТРУБАЧ і старшынёй прафкама вытворчасці і апарату кіравання РУП Белпошта» С.М. РАМАНОЎСКАЙ.

■ Здарэнні

СУТЫКНУЛІСЯ КАТАР І ЛОДКА. АДЗІН ЧАЛАВЕК ПАТАНУЎ

У сталіцы 3 ліпеня на Свіслачы сутыкнуліся прагулачныя катар і вёсельная лодка. У выніку лодка перакулілася і тры чалавекі апынуліся ў вадзе.

— Усё адбылося за 80 метраў ад берага. Глыбіня Свіслачы ў гэтым месцы складала тры метры. Калі на месца прыбылі групы выратавання на водах і вадалазы Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння МНС, двух чалавек з лодкі — дзяўчыну 1988 года нараджэння і хлопца 1983 года нараджэння — выратавалі людзі, якія праплывалі побач на катамаране. Больш на паверхні вады нікога не было, — распавялі ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях. — Да пошуку мужчыны прыступілі вадалазы і манеўрана-пошукавая група АСВОД. Недзе праз 40 хвілін на дне ракі вадалазы знайшлі цела грамадзяніна 1984 года нараджэння — брата выратаванай дзяўчыны. Абставіны здарэння са слоў відавочцаў і капітана прагулачнага катара такія. Катар рухаўся па экскурсійным маршруце па акваторыі Свіслачы, калі ў раёне вуліцы Старажоўскай капітан заўважыў, што наперарэз судну плыве вёсельная лодка з трыма чалавекамі на борце. Ён даў папераджальны сігнал і паспрабаваў ухіліцца ад сутыкнення. Аднак лодка не змяніла свайго курсу і ўдарылася ў карму катара, пасля чаго перакулілася. Прагулачны катар пашкоджанняў не атрымаў.

Дарэчы, перад выхадам лодкі работнікі пункта пракату выдалі людзям выратавальныя камізэлькі, але на момант здарэння яны не выкарыстоўваліся. Быў праведзены і інструктаж па тэхніцы бяспекі на вадзе, пра што ёсць роспісы ў журнале, дадалі ў міністэрстве. Разбор па факце здарэння праводзіць упраўленне Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па г. Мінску, Беларуская інспекцыя рачнога суднаходства.

ЖОНКА НАЕХАЛА НА СУЖЭНЦА

Увечары такое здарэнне адбылося на беразе штучнага вадаёма ў Бярозе па вуліцы Кар'ернай. Пра яго выратавальнікам паведаміў відавочца, паколькі пацярпеламу патрэбна была іх дапамога.

Абставіны незвычайнага дарожна-транспартнага здарэння такія. Кіроўца «Нісан-Прымера» даставала ключы з замка запальвання і выпадкова запусціла рухавік. Аўтамабіль пачаў рухацца і наехаў на сужэнца жанчыны. Апошні адпачываў на беразе. У выніку нагу мужчыны зацісnула паміж прывадной паўвоссю і рычагом падвескі. Работнікам МНС давялося пры дапамозе гідраўлічнага інструмента вызваляць чалавека.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

НА ВЕЛАСІПЕДЗЕ Ў БУДСЛАЎ

МІТРАПАЛІТ Тадэвуш Кандрусевіч узначаліў веласіпедную пілігрымку ў санктуарый Маці Божай у Будславе.

Раніцай каля муроў касцёла святых Сымона і Алены людзей хапала. Сабраліся тыя, хто вырашыў выправіцца ў штогадовае паломніцтва да абраза Маці Божай, апякункі Беларусі, не пешшу, не на аўтобусах, а на веласіпедах. Разам з вернікамі і **Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ, Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп**, які не толькі блаславіў пілігрымаў на добры шлях, але і правёў на веласіпедзе вернікаў з Мінска.

— Да Будслава ад сталіцы 120 кіламетраў. У дарозе вернікі (агулам з Мінска выправілася 17 чалавек) будуць тры дні, — тлумачыць ксёндз **Юрый САНЬКО, часова выконваючы абавязкі прэс-сакратара Канферэнцыі Каталіцкіх біскупаў у Беларусі.** — Гэта адно з шэрагу паломніцтваў у Будслаў. Тры дні таму са сталіцы выправілася пешае, колькасць якога — 300 чалавек. А пазаўчора рушыла пакутная пілігрымка, людзі якой харчуюцца толькі хлебам і вадой.

Як дадаў ксёндз Юрый, на веласіпедах у Будслаў паехалі і з іншых парафій. Таму агульная колькасць пілігрымаў-веласіпедыстаў з розных мясцін краіны будзе значна большай.

— У нас на вёсцы іншага транспарту не было. Конь, ногі і веласіпед, — з усмешкай кажа Мітрапаліт. — Я амаль кожны дзень на веласіпедзе езджу.

Тарас ШЧЫРЫ, фота аўтара.

■ На мяжы трох краін

АДЗІНСТВА Ў СТЫЛІ ПОСТ-МАДЭРН

ФЕСТЫВАЛЬ «Славянскае адзінства» 44-ы раз прайшоў на мяжы трох краін ля манумента Дружбы. У канцы 60-х усё пачыналася з камсамольскіх вечарын жыхароў суседніх вёсак, а цяпер яго ўдзельнікамі сталі больш за 20 тысяч чалавек — беларусаў, рускіх, украінцаў. Пачынаць славянскі фестываль з агульнага набажэнства апошнім часам стала добрай традыцыяй. Тым больш што другі год запар братоў-славян у гэты дзень вітае Патрыярх Маскоўскі і Усяе Русі Кірыл.

Патрыярх Маскоўскі і Усяе Русі Кірыл.

— Доўгі час мы жылі як адзін народ у адной дзяржаве. Тры магутныя галіны выраслі з адзінага кораня. Але мы павінны памятаць, што не могуць галіны квітнець і тым больш прыносіць плады, калі яны будуць адсечаны ад адзінага ствала і ад адзінага кораня. Не можа гісторыя нашых народаў вылічвацца толькі дзясяткамі гадоў — яна ідзе ў глыб стагоддзяў. І праз гістарычны працэс і традыцыю перадаюцца нам жыватворныя токі. Гэтая агульнасць сфарміравана ўсёй тысячагадовай гісторыяй, падтрымана адзінай праваслаўнай верай, адной культурай, агульнымі духоўнымі і маральнымі каштоўнасцямі, — сказаў Патрыярх.

«Славянскае братэрства даражэй за багацце», — нагадаў народную прыказку старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Дворнік. І дадаў, што на працягу многіх гадоў мы з'яўляемся не толькі добрымі суседзямі, але і надзейнымі партнёрамі. Беларусь, Расія і Украіна цесна супрацоўнічаюць практычна ва ўсіх галінах.

— У свеце дастаткова месцаў, дзе сыходзяцца землі розных краін. Але ж такога духоўнага адзінства, такіх трывалых сувязяў сяброўства і супрацоўніцтва, якія звязваюць рускіх, украінцаў і беларусаў, больш няма нідзе. Мы спадзяёмся, што гэтыя сувязі будуць толькі ўмацоўвацца, — падкрэсліў Уладзімір Дворнік.

Моладзевы форум, арганізатарам якога сёлета стала Гомельшчына, прайшоў пад дэвізам «Будучыню будаваць маладым!». На гэты раз традыцыйныя нацыянальныя строі і фальклор адышлі на другі план, а на першы выйшлі моладзевыя субкультуры і ўсё тое, што аб'ядноўвае цяперашняе касмапалітычнае пакаленне славян. Ганаровым гасцям, у тым ліку і Патрыярху Маскоўскаму Кірылу, губернатарам Гомельскай, Бранскай і Чарнігаўскай абласцей, давялося бліжэй пазнаёміцца з арт-аб'ектамі выставы сучаснага мастацтва «Пакаленне Next», а таксама выступленнямі ў экстрэмальных відах спорту. Эмоцыі публікі не маглі стрымаць нават палітыкі і духоўныя асобы.

Музычна-харэаграфічная кампазіцыя «Будучыню будаваць маладым!»

Ад Гомельскай вобласці на галоўнай фестывальнай пляцоўцы выступілі народны артыст Беларусі Анатоль Ярмоленка і дзяржаўны ансамбль «Сябры», узорная студыя цыркавога мастацтва «Арэна», балет гомельскай дзіцячай харэаграфічнай школы мастацтваў, брэйк-група «Лук раўн», каманда кікбаксёраў і група барабаншчыкаў...

Дарэчы, з гэтага года фестываль можа зацікавіць і калекцыянераў-філатэлістаў. Мастацкі канверт з лагатыпам манумента, выпушчаны спецыяльна да свята, урачыста адштэмпеляваны кіраўнікамі Гомельскай, Чарнігаўскай і Бранскай абласцей.

Цяперашняе свята, арганізаванае беларускім бокам, запомніцца многім сваім сучасным фарматам. А вось чым здзівіць гасцей налета, будуць думаць нашы суседзі. У 2013 годзе эстафету фестывалю прымае Украіна.

Ірына АСТАШКЕВІЧ, фота аўтара

Правила рекламной игры «Всё вкуснее дома с Coca-Cola»

Всё вкуснее дома с Coca-Cola

РУБЛЁВСКИЙ СЕТЬ УНИВЕРСАМОВ

1. Сведения об организаторе рекламной игры.
Организатором рекламной игры является общество с ограниченной ответственностью «Рефорте» с местонахождением: Республика Беларусь, 220043, г. Минск, пр. Независимости, д.95, 6 этаж административного здания, комн. 24, р/с 3012206140017 в ЗАО «Абсолютбанк» в г.Минск, код 898, УНП 100422707. Заинтересованным лицом является ИП «Кока-Кола Бевриджиз Белоруссия», поселок Колядичи, Минский район, УНП 100373962.
2. Наименование и цели рекламной игры.
Рекламная игра имеет наименование «Всё вкусное дома с Coca-Cola» и проводится в соответствии с законодательством Республики Беларусь в целях стимулирования реализации напитков безалкогольных газированных «Кока-Кола», «Кока-Кола Лайт», «Фанта вкус Апельсина», «Фанта вкус Лимона», «Фанта вкус Ананаса», «Спрайт», производимых ИП «Кока-Кола Бевриджиз Белоруссия» в бутылках емкостью 0,5, 1 и 2 литра (далее – «Напиток»).
3.Территория проведения рекламной игры.
Рекламная игра проводится в следующих универсамах сети «Рублевский» в городах Минск, Витебск, Гомель, Гродно, Борисов (Республика Беларусь): (см. таблицу)
4. Сроки проведения рекламной игры.
Рекламная игра проводится с 5 июля по 31 августа 2012 года.
Период покупки: с 5 июля по 5 августа 2012 года.
Период выдачи призов «Сумка для покупок», «Кухонный фартук», «Поднос-подушка», «Полотенце пляжное» в центрах выдачи призов: с 13 июля по 18 августа 2012 года.
Период выдачи призов «Холодильник - сувенир» в офисе организатора: с 13 июля по 24 августа 2012 года.
5. Регламент деятельности комиссии по проведению рекламной игры.
Для проведения рекламной игры Организатором создана комиссия по проведению рекламной игры (далее – «Комиссия») в составе 5 человек, включая председателя Комиссии.
Комиссия осуществляет свою деятельность в соответствии с зарегистрированными в установленном порядке Правилами данной Игры (далее – Правила рекламной игры).
Комиссия осуществляет контроль за соблюдением Правил проведения рекламной игры и руководствуется в своей деятельности настоящим регламентом.
Члены комиссии обязаны осуществлять возложенные на них полномочия в течение срока проведения рекламной игры на безвозмездной основе.
Члены Комиссии обязаны принимать участие в заседаниях Комиссии, участвовать в принятии решений, входящих в повестку дня Комиссии, при принятии решений руководствоваться собственным убеждением с учетом положений действующего законодательства Республики Беларусь, осуществлять контроль за правильностью проведения настоящей рекламной игры, включая порядок выдачи призов, проводить розыгрыши рекламной игры с оформлением соответствующих протоколов, рассматривать возникающие споры при проведении рекламной игры и розыгрыше призового фонда, выполнять иные обязанности, необходимые для проведения рекламной игры в соответствии с требованиями действующего законодательства Республики Беларусь и настоящих Правил.
Заседания Комиссии проводятся по инициативе Организатора или председателя Комиссии.
Вопросы, входящие в повестку дня, определяются Организатором и (или) членами Комиссии.
Заседания комиссии проводятся в обязательном порядке при проведении розыгрышей призов, а для решения иных вопросов - по мере необходимости.
Заседания Комиссии правомочны при наличии большинства членов ее состава.
В случае отсутствия на заседании комиссии председателя Комиссии, лицом, исполняющим его обязанности, избирается один из присутствующих членов комиссии.
Решения комиссии принимаются открытым голосованием простым большинством голосов.
При равенстве голосов решающим является голос председателя Комиссии или лица, исполняющего его обязанности.
Решения Комиссии оформляются протоколом, который подписывается всеми присутствующими на заседании членами комиссии.
6. Состав комиссии по проведению рекламной игры.
В состав Комиссии по проведению рекламной игры входят:
1. Прокалович Татьяна Анатольевна, специалист по рекламе ООО «Рефорте»– председатель комиссии;
2. Чергейко Юлия Александровна, специалист отдела маркетинга ИП «Кока-Кола Бевриджиз Белоруссия»;
3. Ковалевский Валентин Станиславович, специалист по рекламе ООО «Рефорте»;
4. Красовская Наталья Олеговна, специалист по маркетингу ИП «Кока-Кола Бевриджиз Белоруссия»;
5. Остроух Екатерина Андреевна, ведущий специалист по рекламе СООО «Супермаркет-трейд».
7. Состав, размер и источники формирования призового фонда рекламной игры.
Размер призового фонда составляет 77 434 552 (Семьдесят семь миллионов четыреста тридцать четыре тысячи пятьсот пятьдесят два) белорусских рубля.
Призовой фонд сформирован за счет имущества Заинтересованного лица.
8. Участники рекламной игры.
К участию в Рекламной игре приглашаются все граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие в Республике Беларусь, и лица, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно в ней проживающие. Участники Рекламной игры гарантируют, что они не являются работниками Организатора и членами их семей; собственниками и работниками субъектов хозяйствования, участвующих в изготовлении рекламных и других материалов для Рекламной игры, и членами их семей.
9. Порядок участия в Рекламной игре и получения призов.
9.1. Для участия в рекламной игре необходимо в период с 5 июля по 5 августа 2012 г.:
- Совершить покупку Напитков в торговых объектах, указанных в п.3. Правил рекламной игры;
- Собрать чеки/копии чеков, подтверждающие покупку от 10 (Десяти) до 30 литров Напитка и более в торговых объектах, указанных в п.3. Правил рекламной игры, для участия в розыгрыше Приза «Сумка для покупок» или Приза «Кухонный фартук»;
или
- Собрать чеки/копии чеков, подтверждающие покупку от 30 (Тридцати) до 50 (Пятидесяти) литров Напитка и более в торговых объектах, указанных в п.3. Правил рекламной игры, для участия в розыгрыше Приза «Поднос-подушка» или Приз «Полотенце пляжное»;
или
- Собрать чеки/копии чеков, подтверждающие покупку 50 (Пятидесяти) литров Напитка и более в торговых объектах, указанных в п.3. Правил рекламной игры, для участия в розыгрыше Приза «Холодильник – сувенир».
9.2. Первым обратиться к представителю Организатора, предоставив чек/копию чека, подтверждающий покупку:
- в Центры выдачи призов, указанные в п.9.3. за призами «Сумка для покупок», «Кухонный фартук», «Поднос-подушка», «Полотенце пляжное» в период с 13 июля по 18 августа 2012 г.
- в офис Организатора за призами «Холодильник – сувенир» в период с 13 июля по 24 августа 2012 г.
9.3. Центры выдачи призов, расположенные по следующим адресам, работают с 13 июля 2012 г. по субботам с 14:00 часов и в соответствии с режимом работы предприятия торговли, в котором Центр выдачи призов расположен, но не позднее, чем до 18:00 часов, до тех пор, пока призы будут в наличии (количество призов для каждого Центра выдачи призов указано в таблице), но не позднее 18 августа 2012 г. включительно: (см. таблицу)
9.4. Порядок получения призов «Холодильник-сувенир»:
Участнику, собравшему чеки/копии чеков, подтверждающих покупку 50 (Пятидесяти) литров Напитка и более в торговых объектах, указанных в п.3. Правил рекламной игры, необходимо первым обратиться для получения приза в период с 5 июля по 24 августа 2012 г. в офис Организатора по адресу: г.Минск, пр-т Независимости, 95, 6 этаж административного здания, комн. 24, тел. (017) 263 37 63.
Необходимым условием для получения приза «Холодильник-сувенир» является предоставление Победителем информации, необходимой для заполнения справки, подаваемой в налоговую инспекцию, о выданных призах, в том числе паспортных данных, места жительства.
После выдачи приза «Холодильник-сувенир» Победителю в налоговые органы по месту проживания Победителя направляется уведомление о полученном доходе.
Победитель самостоятельно несет ответственность за соблюдение им действующего законодательства в сфере налогообложения, согласно главы 16 Особенной части Налогового Кодекса Республики Беларусь.
9.5. Другие положения:
Призы получают участники, первыми обратившиеся в Центры выдачи призов либо в офис Организатора согласно п.п. 9.1.-9.4.
Каждому участнику, предъявившему необходимое количество чеков/копий чеков, подтверждающих выполнение Правил рекламной игры, единовременно может быть выдано не более 5 (Пяти) Призов.
При получении приза участник передает чеки/копии чеков, подтверждающих выполнение Правил рекламной игры, представителю Организатора рекламной игры в Центре выдачи призов или офисе Организатора. Все чеки/копии чеков, по которым получены призы, возврату участникам не подлежат и повторного права на получение приза не предоставляют.
Для получения приза Победитель Рекламной игры должен иметь при себе паспорт либо иной документ, удостоверяющий личность. Несовершеннолетние Победители Рекламной игры получают приз через своих родителей или иных законных представителей по предъявлении последними документов, подтверждающих их правовой статус законного представителя.
Целостность и функциональная пригодность призов рекламной игры должна проверяться участниками непосредственно при его получении. Организатор не несет ответственности за любые повреждения призов, возникшие после передачи последнего участнику.
В рекламной игре можно принимать участие неограниченное количество раз при условии выполнения каждый раз условий участия, установленных Правилами рекламной игры.
Чеки/копии чеков, отправленные в адрес Организатора по почте, к участию в розыгрыше не допускаются и возврату не подлежат.
Организатор не возмещает участникам игры расходы, связанные с передачей чеков/копий чеков, с проездом к месту получения приза и обратно, а также любые иные расходы.
При получении приза Победитель обязан расписаться в ведомости выдачи призов, в которой указываются Ф.И.О. получателя, дата получения, наименование и вид приза, его стоимость и иные необходимые данные. Роспись Победителя в ведомости свидетельствует о получении приза и отсутствии каких-либо претензий к Организатору игры. Отказ от подписания ведомости выдачи призов и (или) предоставления вышеуказанной информации является основанием для отказа в выдаче приза Победителю.
Денежный эквивалент призов не выплачивается.
С момента передачи приза Победителю, к нему переходят все риски и обязательства, связанные с владением, пользованием и распоряжением призом.
Участники рекламной игры, которые не обратились за получением Приза в установленные настоящими правилами сроки, утрачивают право на получение соответствующего приза.
10. Источник информации об игре.
Правила рекламной игры публикуются в газете «Звязда» и на сайте www.rublevski.by до начала рекламной игры.
Сведения о результатах проведения рекламной игры публикуются в газете «Звязда» в срок до 31 августа 2012 г. Также сведения о результатах проведения рекламной игры публикуются в сети Интернет на сайте www.rublevski.by. не позднее 31 августа 2012 года.
По вопросам, связанным с проведением рекламной игры "Все вкуснее дома с Coca-Cola", участники смогут обратиться по телефону (017) 2390637.

№	Название	Адрес	Время работы
1.	У-м «Рублевский» №1	г. Минск, 2-й переулок Багратиона, 18-А	8.00 - 23.00
2.	У-м «Рублевский» №2	г. Минск,ул. Ольшевского, 4	8.00 - 23.00
3.	У-м «Рублевский» №3	г. Минск, ул. Розы Люксембург, 80	9.00 - 22.00
4.	У-м «Рублевский» №5	г. Минск, ул. Притыцкого, 56	8.00 - 23.00
5.	У-м «Рублевский» №6	г. Минск, ул. Романовская Слобода, 14	8.00 - 23.00
6.	У-м «Рублевский» №7	г. Минск, ул. Калиновского, 67	8.00 - 23.00
7.	У-м «Рублевский» №8	г. Минск, ул. Янки Лучины, 14	10.00 - 23.00
8.	У-м «Рублевский» №9	г. Минск, ул. Плеханова, 91	8.00 - 23.00
9.	У-м «Рублевский» №10	г. Минск, бульвар Шевченко, 18	8.00 - 22. 00
10.	У-м «Рублевский» №11	г. Минск, ул. Кижеватова, 72/1	8.00 - 23.00
11.	У-м «Рублевский» №12	г. Минск, ул. Кольцова, 32	8.00 - 22.00
12.	У-м «Рублевский» №13	г. Минск, проспект Партизанский, 48	9.00 - 23.00
13.	У-м «Рублевский» №14	г. Минск, ул. Розы Люксембург, 163	8.00 - 23.00
14.	У-м «Рублевский» №15	г. Минск, ул. Рафиева, 81-А	8.00 - 23.00
15.	У-м «Рублевский» №16	г. Минск, ул. Уручская, 11-А	8.00 - 23.00
16.	У-м «Рублевский» №18	г. Минск, ул. Толбухина, 4	8.00 - 23.00
17.	У-м «Рублевский» №19	г. Минск, проспект Победителей, 1	8.00 - 23.00
18.	У-м «Рублевский» №20	г. Минск, ул. Сухаревская, 62	8.00 - 22.00
19.	У-м «Рублевский» №21	г. Минск, ул. Кузьмы Чорного, 34/15	8.00 - 23.00
20.	У-м «Рублевский» №22	г. Минск, ул. Алтайская, 66-А	8.00 - 23.00
21.	У-м «Рублевский» №23	г. Минск, проспект Рокоссовского, 1	8.00 - 23.00
22.	У-м «Рублевский» №24	г. Минск, ул. Водолажского, 6	8.00 - 23.00
23.	У-м «Рублевский» №25	г. Минск, ул. Шаранговича, 25	8.00 - 23.00
24.	У-м «Рублевский» №26	г. Минск, проспект Пушкина, 12-А	8.00 - 23.00
25.	У-м «Рублевский» №27	г. Минск, ул. Маяковского, 146	8.00 - 23.00
26.	У-м «Рублевский» №31	г. Минск, ул. Райниса, 17	8.00 - 23.00
27.	У-м «Рублевский» №35	г. Минск, ул. Славинского, 45	8.00 - 23.00
28.	У-м «Рублевский» №36	г. Минск, ул. Кижеватова, 7/2	8.00 - 23.00
29.	У-м «Рублевский» №37	г. Минск, ул. Руссиянова, 36	8.00 - 23.00
30.	У-м «Рублевский» №39	г. Минск, пр-т Рокоссовского,114	8.00 - 23.00
31.	У-м «Рублевский» №40	г. Минск, ул. П. Панченко,70	9.00 - 21.00
32.	У-м «Рублевский» № 43	г. Минск, ул. Нестерова, 58	8.00 - 23.00
33.	У-м «Рублевский» № 28	г. Гомель, ул. Максима Богдановича, 2	8.00 - 23.00
34.	У-м «Рублевский» № 33	г. Витебск, проспект Московский, 86	8.00 - 23.00
35.	У-м «Рублевский» №32	г. Борисов, ул. Гагарина , 64 (а)	9.00-21.00 пн.-чт. 10.00-22.00 пн.-вс.
36.	У-м «Рублевский» № 41	г. Гродно, б-р Ленинского комсомола, 44	8.00-23.00

Название Центра выдачи призов	Адрес Центра выдачи призов	Кол-во призов «Сумка для покупок»	Кол-во призов «Фартук кухонный»	Кол-во призов «Поднос-подушка»	Кол-во призов «Полотенце пляжное»
У-м «Рублевский»№8	г. Минск, ул. Плеханова, 91	170	130	20	15
У-м «Рублевский» №24	г. Минск, ул. Шаранговича, 25	175	130	15	10
У-м «Рублевский» №26	г. Минск, ул. Маяковского, 146	175	130	15	10
У-м «Рублевский» №33	г. Минск, ул. Руссиянова, 36	175	130	15	10
У-м «Рублевский» №35	г.Минск, ул. Кижеватова, 72\1	175	130	15	15
У-м «Рублевский» №27	г. Гомель, ул. М.Богдановича, 2	300	130	25	20
У-м «Рублевский» №30	г. Витебск, пр-т Московский, 86	300	150	25	20
У-м «Рублевский» №32	г. Борисов , ул. Гагарина, 64 (а)	200	70	15	10
У-м «Рублевский» №41	г. Гродно, б-р Ленинского комсомола,44	300	150	25	20

Наименование	Количество, шт	Цена за единицу, бел.руб. (с НДС 20%)	Сумма, бел.руб. (с НДС 20%)
Сумка для покупок	1 970	10 679,86	21 039 340
Фартук кухонный	1 150	20 550,66	23 633 259
Подставка с подушкой (далее – Приз «Поднос-подушка»)	170	115 340,4	19 607 868
Полотенце пляжное	130	46 864,8	6 092 424
Приз «Холодильник – сувенир»	8	882 707,62	7 061 661

Свидетельство о государственной регистрации игры №2039, выданное Министерством торговли 28.06.2012.

Coca-Cola является зарегистрированным товарным знаком The Coca-Cola Company. © 2012 The Coca-Cola Company. Напиток сертифицирован.

ООО «Рефорте», УНП 100422707

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

5 ЛІПЕНЯ 2012 г.
ЧАЦВЕР
№ 12 (15698)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Канкурсант ад Беларусі на «Славянскім базары ў Віцебску» Яўген СЛАВІЧ:

«МУЖЧЫН НА СЦЭНЕ НЕ ХАПАЕ. ТАМУ Я — МУЖЧЫНА!»

Кожны год на конкурсе маладых выканаўцаў на «Славянскім базары ў Віцебску» запальваецца новая «зорка». І як прыемна, калі сярод шматлікіх канкурсантаў з розных краін постсавецкай прасторы перамагае беларус — прыгожы, годны выканаўца з цудоўным голасам. Лепшы штуршок у кар'еры эстраднага спевака складана ўявіць. Бо знакамітым становішся літаральна ў адзін вечар: цябе ведае ўжо не толькі ўся Беларусь, але і іншыя шматлікія краіны-ўдзельніцы гэтага музычнага свята. Сёлета Беларусь на конкурсе маладых выканаўцаў на «Славянскім базары ў Віцебску» прадставіць Яўген Славіч.

Малады спявак скончыў Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў, цяпер з'яўляецца студэнтам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры, аддзялення мастацтва эстрады (вакал). Яўген лічыць, што яго талент перададзены генетычна: дзядуля быў, так бы мовіць, спеваком-самародкам, аднак не змог рэалізавацца з-за таго, што пачалася вайна. Пэўна, унук зможа прадоўжыць справу дзеда. Сам Яўген з горада Чэрвеня, маці маладога чалавека працуе канцэртмайстарам у мясцовай школе мастацтваў. Менавіта яна і дапамагла сыну развіць талент.

Наш карэспандэнт сустрэўся з Яўгенам Славічам, каб даведацца, як ідзе падрыхтоўка да «Славянскага базара», з якім настроем спявак туды збіраецца і чым жыве, акрамя музыкі.

Інтэрв'ю адбылося ў невялікі перапынак паміж рэпетыцыямі ў Моладзевым тэатры эстрады. Яўген пранікнёна зноў і зноў выконваў кампазіцыі, напісаныя спецыяльна для «Славянскага базара». Калі ж спусціўся са сцэны, то адзначыў, што проста не заўважае, як ідзе час, бо займаецца любімай справай.

— Яўген, распавядзі, як ідзе падрыхтоўка да «Славянскага базара»?

— Спачатку мы сустракаемся з рэжысёрам Аленай Рыбчынскай і дзве-тры гадзіны робім пастаноўкі сцэнічных нумароў. Затым прыязджае педагог па вакале Алена Атрашкевіч, і з ёй мы столькі ж працуем. Пасля еду ў прадзюсарскі цэнтр «Спамаш» — там мы падбіраем і прымяраем адзенне, робім фотасесіі, запісваем відэа. Так імгненна пралятае кожны дзень. Аднак мне гэта даспадобы, я трачу шмат часу, але і не валюся з ног ад стомленасці. Узгадваецца выдатнае выказванне: «Знайдзіце сабе справу па душы, і вам ніколі не прыйдзецца працаваць». Так яно і ёсць.

— Прыадкрый таямніцу, якія нумары ты прадставіш на «Славянскім базары»?

— Мы рыхтуем адразу тры творы. У адной пастаноўцы я буду выглядаць пад street-fashion (вулічная мода. — **Аўт.**), па-моладзеваму, калі казаць прасцей. Песня «Мы згубіліся» ідзе ў поп-рокавым ключы. Галоўны герой — малады чалавек, што спявае пра каханне. Як усе мы ў такім узросце, ён не можа да канца вызначыцца са сваім пачуццем... Песню напісаў Леанід Шырын, яна мне блізкая, я змагу перадаць яе гледачам.

Другая кампазіцыя «Музыкант» прысвечана памяці музыкантаў, якія сышлі. Яе напісала Алена Атрашкевіч, якая з'яўляецца маім кіраўніком па вакале і кампазітарам. Песня распавядае пра тое, што, калі малады музыкант ідзе сваім шляхам, яму трапляюцца розныя славутыя людзі. Варта аддаць даніну мінуламу, каб у будучым таксама дасягнуць пэўных высот.

І «візітка» — гэта кампазіцыя «Aligote», у перакладзе «сыходзь». Частка песні выконваецца на іспанскай мове. Рускі тэкст напісала Людміла Войнава. Музыка выразна перадае настрой — усе перапады, сумненні, размовы. У аснову пакладзена гісторыя, калі дзяўчына, мякка кажучы, павяла сябе не зусім карэктна ў адносінах да хлопца. І ён, здаецца, і кахае яе, але і заставацца з ёй ужо не можа.

— Ты ўсё так эмацыянальна выконваеш. Пэўна, перажыў падобныя пачуцці ў сваім жыцці?

— Несумненна. Я не скажу, што шмат усяго было, але ёсць у жыцці такія моманты, да якіх мы вяртаемся і перажываем іх пастаянна.

— Была якая-небудзь гісторыя, як у Сашы Рыбака?...

— Ды не. Але кожны ўспрымае пэўную гісторыю па-рознаму. Для некага ўсё можа выглядаць смешным, а для некага гэта штосьці вельмі глыбокае і недаступнае іншым людзям. Ты можаш толькі прыадкрыць таямніцу, але не пускаць іх туды...

— Калі знаёмыя людзі даведаліся, што ты будзеш прадстаўляць Беларусь на такім прэстыжным конкурсе, як «Славянскі базар», ці змянілася іх стаўленне да цябе?

— Натуральна. Але сябры засталіся сябрамі. Калі казаць пра тое, ці з'явілася зайздрасць, то, магчыма, яна і з'явілася, але людзі гэтага не паказваюць. Звяртаць увагу на такія рэчы, як зайздрасць і злосць, проста няма часу. Прыйшоў — і панеслася: праца да стомы. Насамрэч, так і трэба, каб пасля, калі спытаюць, як у цябе гэта атрымалася, адказаць: «Я проста не пакінуў сілы на зваротны шлях — таму і атрымалася».

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

Абітурыент — 2012

УСЯГО ТРЫ ГАДЗІНЫ НА РОЗДУМ БУДЗЕ Ў АБІТУРЫЕНТАЎ У АПОШНІ ДЗЕНЬ

4 ліпеня ў Беларусі была пастаўлена апошняя кропка ў цэнтралізаваным тэсціраванні. І хоць сёлета зноў знайшліся ахвотныя падкінуць у інтэрнэт інфармацыю пра тое, што ў тэстах былі заданні без правільных адказаў, зноў не абышлося без маладых людзей, якія свядома сапсавалі на тэсціраванні свае бланкі з адказамі, пакінуўшы там нецэнзурныя словы — усё роўна канкурыраваць з Расіяй, дзе Адзіны дзяржаўны экзамен АДЭ традыцыйна суправаджаецца шматлікімі скандаламі, мы, на шчасце, не можам.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Новыя жорсткія правілы АДЭ (адзінага дзяржаўнага экзамену) — выдаленне з экзамену ў выпадку выяўлення мабільнага тэлефона, абнуленне вынікаў і немагчымасць пераздачы экзамену сёлета — відаць па ўсім, толькі распалілі расійскіх школьнікаў. За што многім з іх і прыйшлося расплачвацца. Маленькай замалёўкай да АДЭ-2012 можа служыць наступны дыялог. Абітурыент тэлефануе на «гарачую» лінію і пытаецца: «А калі я пранясу мабільнік і мяне не зловяць — ці залічаць мне АДЭ?» Адказ: «Вам лепш не рызыкаваць і не браць на экзамен тэлефон. Усё роўна не ўдасца ім скарыстацца...» Юнак: «А калі я выйду з ім у прыбіральню і спішу там?»

Федэральная служба па наглядзе ў сферы адукацыі і навукі канстатуе, што ў гэтым годзе ў тысячы разоў зменшылася колькасць уваходжанняў у інтэрнэт-прастору падчас экзамену. Інтэрнэт перастаў быць зонай небяспекі пры правядзенні АДЭ. І нават сацыяльныя сеткі, дзе ў папярэднія гады ў рэжыме онлайн з'яўляліся матэрыялы АДЭ, пайшлі на супрацоўніцтва і на час правядзення працэдуры АДЭ абвясцілі «абет маўчання». І ўсё ж такі пасля таго, як сталі вядомыя вынікі ўсіх удзельніка ў адзінага дзяржаўнага экзамену, Федэральная служба па наглядзе ў сферы адукацыі і навукі заявіла аб сваім намеры пераправерыць экзаменацыйныя работы ў «высакабальных» рэгіёнах — Маскве, Калмыкіі і Інгушэціі. Пад праверку трапляюць рэгіёны, дзе сярэдні бал па АДЭ «анамальна» перавышае сярэднерасійскія паказчыкі. Маскву трапіла пад падазрэнне з-за вялікай колькасці школьнікаў, якія паспяхова здалі фізіку. А ў Калмыкіі і Інгушэціі будуць перапраўрацца высакабальныя і стабальныя работы па грамадазнаўстве і літаратуры.

...АДНАК ПАМЫЛІЦЦА МОЖНА НЕ ТОЛЬКІ З ПАДЛІКАМІ, АЛЕ І З ВЫБАРАМ ПРАФЕСІІ

6 жніўня — апошні дзень залічэння

У адрозненне ад Расіі, дзе правядзенне адзінага дзяржаўнага экзамену традыцыйна суправаджаюць гучныя справы, звязаныя з махлярствам, у нашай краіне на хвалі інтарэсу аказваюцца, як правіла, зусім іншыя пытанні.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ»)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
5 07 2012 г.

УСЯГО ТРЫ ГАДЗІНЫ НА РОЗДУМ БУДЗЕ Ў АБІТУРЫЕНТАЎ У АПОШНІ ДЗЕНЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Напрыклад, многіх хвалююць дастаткова нізкія балы ўдзельнікаў тэсціравання па матэматыцы і фізіцы. І хоць арганізатары цэнтралізаванага тэсціравання ўпарта адмаўляюцца называць сёлетнія сярэднія балы, але і па ўскосных фактах можна здагадацца, што абітурыенты зноў не парадавалі экзаменатараў сваімі ведамі. Так, пераадолець парог у 7 балаў на ЦТ па матэматыцы не здолелі аж 11 тысяч чалавек, хоць для таго, каб іх набраць, трэба было выканаць усяго 3-4 заданні з 30. А 796 чалавек увогуле ўмудрыліся набраць 0 (нуль) балаў.

Па фізіцы выканаць усе 30 заданняў за адведзеныя 180 хвілін змаглі толькі два ўдзельнікі тэсціравання. Не справіліся ні з адным заданнем, нават з элементарнымі, 41 абітурыент — гэта азначае, што яны атрымалі 0 балаў. Менш як 7 балаў набралі 3 тысячы 915 чалавек.

Для параўнання: па хіміі і грамадазнаўстве не змаглі пераадолець устаноўлены парог у 7 балаў усяго 0,2% удзельнікаў, па біялогіі — 0,15%. Да таго ж і нулявыя вынікі атрымалі па гэтых дысцыплінах адзінкі з абітурыентаў.

Арганізатары цэнтралізаванага тэсціравання абяцаюць перадаць усе сертыфікаты ўдзельнікаў у пункты правядзення ЦТ 6—7 ліпеня, паколькі ўжо 9 ліпеня ў Беларусі стартуе чарговы этап прыёмнай кампаніі — з гэтага дня ў ВНУ «сілавых» ведамстваў і творчых ВНУ распачынаецца прыём дакументаў. Першымі, па традыцыі, прыйдуць у прыёмныя камісіі абітурыенты Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў, Ваеннай акадэміі, Камандна-інжынернага інстытута, Гомельскага інжынернага інстытута МНС, Акадэміі мастацтваў, Акадэміі музыкі і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры.

Дарэчы, у гэтым годзе многія беларускія ВНУ будуць ажыццяўляць набор на новыя спецыяльнасці (прынцыпова новыя для рынку працы і новыя — непасрэдна для іх). Так, у Беларускім дзяржаўным універсітэце адкрываецца падрыхтоўка па спецыяльнасцях «Эканамічная інфарматыка», «Сацыяльныя камунікацыі» і «Крыптаграфія» (на ваенным факультэце). У Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце — «Тэхналогія лекавых сродкаў». У БДПУ імя М. Танка — падвоеная спецыяльнасць «Біялогія. Фітадызайн ландшафту і інтэр'ера». У Мінскім дзяржаўным вышэйшым авіяцыйным каледжы — «Беспілотныя авіяцыйныя комплексы». У БНТУ — «Тэхнічнае забеспячэнне спартыўных аб'ектаў». У БДУІР — «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі ў забеспячэнні прамысловай бяспекі» і «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі ў лагістыцы».

Нагадаем, што паколькі зацвярджэнне новай рэдакцыі правілаў прыёму ў ВНУ было адкладзена на наступны навучальны год, то выпускнікі гарадскіх і сельскіх устаноў адукацыі сёлета будуць залічвацца па асобным конкурсе. Захаваюцца таксама і льготы для пэўных катэгорый абітурыентаў. А галоўнай адметнасцю чарговай прыёмнай кампаніі стане эксперымент па віртуальным залічэнні.

Што значыць быць віртуальна залічаным?

Летась эксперымент стартаваў у Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі. Пры падачы дакументаў у БДУІР абітурыенты ўказвалі дзве або тры спецыяльнасці ў парадку расстаноўкі ўласных прыярытэтаў. Спачатку абітурыент са сваім наборам сертыфікатаў удзельнічаў у конкурсе на спецыяльнасць, указаную ў прыярытэтах першай, а затым — па другой і трэцяй спецыяльнасцях. Аўтаматызаваная сістэма залічэння дазволіла абітурыентам максімальна выкарыстаць усе шанцы для паступлення ў ВНУ. Да таго ж абітурыентам з добрай падрыхтоўкай, якія вытрымалі агульны конкурс па ўніверсітэце, але пры гэтым не прайшлі па конкурсе ні на адну з указаных у заяве спецыяльнасцяў, было прапанавана паступіць на іншую спецыяльнасць, дзе заставаліся вакантныя месцы. У выніку больш як 90% абітурыентаў вынікамі залічэння засталіся задаволеныя. А ў апошні дзень падачы дакументаў ужо праз 15 хвілін пасля таго, як зачыніліся дзверы прыёмнай камісіі, фармальна залічэнне было завершана. Для гэтага было дастаткова толькі націснуць на камп'ютарную клавішу...

У гэтым годзе эксперымент пайшоў далей: абітурыенты БДУІР будуць указваць пры падачы заявы ўжо не тры, а пяць спецыяльнасцяў: першую — прыярытэтную, а затым чатыры «запасныя». Больш за тое, у адпаведнасці з парадкам прыёму ў БДУІР на 2012 год, конкурс будзе праводзіцца па групе спецыяльнасцяў тэхніка-тэхналагічнага і эканамічнага профіляў у два этапы. Тыя абітурыенты, якія паступаюць на «бюджэт», спачатку пройдуць папярэдняе залічэнне па асобным конкурсе сярод абітурыентаў— выпускнікоў гарадскіх і сельскіх устаноў адукацыі, а далей раздзяленне на гараджан і вяскоўцаў не будзе: ранжыраванне будзе ажыццяўляцца строга па колькасці набраных балаў. Фактычна тое ж самае прапісана ў праекце новых правілаў прыёму ў ВНУ, дзе прадугледжваецца адмена асобнага конкурсу для выпускнікоў гарадскіх і сельскіх устаноў адукацыі.

Да таго ж сёлета да эксперыменту далучацца яшчэ шэсць беларускіх ВНУ: Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт, Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт, Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Я.Купалы, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф.Скарыны і Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт. Абітурыентам, якія пададуць дакументы ў гэтыя ВНУ на дзённую бюджэтную форму навучання, будзе прапанавана прайсці анкетаванне і ўказаць 5 прыярытэтных варыянтаў для паступлення.

Як гэта будзе выглядаць на практыцы? Абітурыенту, які прынёс свае дакументы (напрыклад, у БНТУ), прапануюць запоўніць анкету і ўказаць у ёй да пяці прыярытэтаў залічэння (варыянты паступлення могуць указвацца як у рамках адной ВНУ, так і ў рамках усіх ВНУ, задзейнічаных у эксперыменце). Дарэчы, ад запаўнення анкеты можна будзе адмовіцца. А камп'ютарная праграма сама будзе падлічваць, куды і на якую спецыяльнасць абітурыент можа паступіць са сваім наборам сертыфікатаў. **Аднак у гэтым годзе віртуальнае залічэнне не будзе мець ніякай сілы і будзе праходзіць паралельна са звычайным.** Гэта значыць, што калі абітурыент падаў заяву на пэўную спецыяльнасць, то толькі на яе ён і зможа паступіць.

Працоўныя будні прыёмных камісій

У вызначаныя правіламі прыёму тэрміны прыёмныя камісіі будуць працаваць з панядзелка па суботу з 9.00 да 18.00. Аднак калі апошні дзень прыёму дакументаў, здачы ўступных іспытаў ці залічэння абітурыентаў прыпадае на нядзелю, прыёмная камісія працуе таксама і ў гэты дзень з 9 гадзін раніцы да 18 гадзін. Такім чынам, сёлета прыёмныя камісіі ВНУ МУС, МНС, Міністэрства абароны і Пагранкамітэта будуць працаваць па суботах 14, 21 ліпеня і ў нядзелю — 22 ліпеня. Прыёмныя камісіі ВНУ Міністэрства культуры будуць працаваць па суботах 14, 21 і 28 ліпеня, а таксама дзве нядзелі — 15 і 22 ліпеня (у выпадку правядзення ў гэтыя дні ўступных іспытаў па творчасці).

Прыёмныя камісіі ВНУ другога патоку будуць працаваць па суботах 21, 28 ліпеня і 4 жніўня і ў нядзелю — 29 ліпеня (для ВНУ, якія праводзяць унутраныя экзамены). І ўсё ж такі хацелася б параіць абітурыентам не адкладваць свой візіт у прыёмную камісію на апошні дзень, таму што такіх «разумнікаў» можа быць шмат, і сітуацыя з конкурсам можа змяніцца літаральна за некалькі апошніх гадзін ці ўжо пасля закрыцця прыёмных камісій. Часцей за ўсё перападаюць свае дакументы тыя, чый бал знаходзіцца на мяжы прахаднога, а ў гэтай сітуацыі можна і памыліцца з падлікамі.

Інфармацыя аб ходзе прыёму дакументаў будзе абнаўляцца штодня кожныя тры гадзіны: у 9.00, 12.00, 15.00 і 18.00. Але ў апошні дзень прыёму дакументаў інфармаванне абітурыентаў спыніцца ў 15 гадзін! У абітурыентаў будуць усяго тры гадзіны, каб канчаткова вызначыцца з выбарам ВНУ або спецыяльнасці. У апошні дзень прыёму дакументаў допуск абітурыентаў у будынак навучальнай установы, у якой размешчана прыёмная камісія, спыніцца ў 18 гадзін. У 18 гадзін прыёмная камісія таксама спыніць выдачу абітурыентам дакументаў з мэтай іх падачы на іншую спецыяльнасць, пры гэтым будзе ажыццяўляцца прыём дакументаў ад усіх абітурыентаў, што паспелі трапіць у будынак да таго, як дзверы на ўваход зачыніліся.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Якім чынам арганізуецца асобны конкурс для сельскай моладзі?

Усё даволі проста: на месцы, вызначаныя кантрольнымі лічбамі прыёму (без уліку лічбаў прыёму на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі) залічваюцца асобы, якія маюць ільготы на залічэнне без уступных іспытаў і па-за конкурсам, а тыя месцы, што засталіся, дзеляцца прапарцыянальна пададзеным заявам сярод дзвюх катэгорый абітурыентаў — сельскіх і гарадскіх. Між іншым, не пашкодзіць нагадаць, што залічэнне па асобным конкурсе сярод абітурыентаў-гараджан і абітурыентаў з сельскай мясцовасці можа ажыццяўляцца толькі на бюджэтныя месцы. А пры залічэнні на ўмовах аплаты дзейнічае агульны конкурс, без раздзялення выпускнікоў на сельскіх і гарадскіх.

Будзь у курсе:

Сертыфікаты будуць выдавацца абітурыентам пры прад'яўленні дакумента, які засведчыць іх асобу, і пропуску з адзнакай «Тэсціраванне прайшоў». Згодна з Палажэннем аб правядзенні ЦТ, абітурыент атрымлівае сертыфікат асабіста пад подпіс у ведамасці выдачы сертыфікатаў цэнтралізаванага тэсціравання. Затым пропуск у яго адбіраецца. У выпадку страты пропуска абітурыент падае заяву аб выдачы яму сертыфіката без прад'яўлення пропуска. У выпадку замены дакумента, які сведчыць асобу абітурыента, у перыяд паміж датай рэгістрацыі ў якасці абітурыента і датай выдачы сертыфіката ці падачы дакументаў у прыёмную камісію навучальнай установы, сертыфікат афармляецца ў адпаведнасці са звесткамі новага дакумента, які сведчыць асобу. А ў выпадку страты сертыфіката (ці калі знешні выгляд сертыфіката быў сапсаваны), Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў афармляе яго дублікат. У гэтым выпадку ў правым верхнім ражку на сертыфікаце ставіцца адзнака «дублікат». Не выдадзеныя абітурыентам сертыфікаты захоўваюцца ў пунктах правядзення тэсціравання да канца гэтага каляндарнага года, а затым знішчаюцца. Электронныя ж выявы запоўненых абітурыентамі бланкаў адказаў захоўваюцца ў Інстытуце кантролю ведаў на працягу 75 гадоў. Ні бацькам, ні сваякам абітурыента сертыфікаты выдавацца не будуць, нават калі тыя прад'явяць у пункт тэсціравання дакументы ўдзельніка тэставых выпрабаванняў. У адпаведнасці з артыкулам 186 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, іншая асоба можа атрымаць сертыфікат толькі па аформленай ва ўстаноўленым парадку даверанасці.

Парадак замены сертыфіката:

Для замены сертыфікатаў у Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў неабходна прад'явіць наступныя дакументы:

Пры страце сертыфіката:

1. Дакумент з любой рэдакцыі газеты, які пацвярджае размешчанае там паведамленне аб несапраўднасці сертыфіката на імя заяўніка;

2. Ксеракопію пашпарта;

3. Заяву на імя дырэктара РІКВ.

Пры замене пашпарта (віду на жыхарства):

1. Даведку з органаў унутраных спраў аб замене пашпарта (віду на жыхарства);

2. Ксеракопію новага пашпарта;

3. Сертыфікат, які падлягае замене;

4. Заяву на імя дырэктара РІКВ.

Пры дапушчаных у сертыфікаце памылках:

1. Ксеракопію пашпарта;

2. Сертыфікат, які падлягае замене;

3. Заяву на імя дырэктара РІКВ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ВЯРТАННЕ... ПАМЯЦІ І ГОНАРУ

З кожным годам я ўсё больш адкрываю для сябе Беларусь. Адкрываю ў падарожжах, у сустрэчах з людзьмі, у новых фактах з яе гісторыі і культуры, якія становяцца вядомымі дзякуючы працам сучасных даследчыкаў. Я разумею, што нічога не ведала пра яе. Я радуюся, што я такая не адна. Усё больш маладых людзей захапляецца Беларуссю. Узнікаюць аб'яднанні, якія вывучаюць культуру і традыцыі, маладыя людзі адраджаюць старыя абрады, запісваюць старажытныя беларускія песні, вывучаюць свой радавод, сядзяць у архівах, шукаючы цікавыя звесткі. І, адкрываючы нешта новае, дзеляцца каштоўным адкрыццём з іншымі — абменьваюцца інфармацыяй, ладзяць экскурсіі...

Чаму я ўжыла вышэй словы «захапляцца» і «каштоўную інфармацыю»? Таму што са школы мы выходзім... У галаве толькі набор лічбаў, прозвішчаў, асобных фактаў, нягледзячы на тое, што шмат урокаў гісторыі прысвечана вывучэнню Вялікай Айчыннай вайны.

Сёння ў Жлобінскім раёне можна наведаць помнік дзецям-ахвярам вайны. Нават замежныя госці, калі трапляюць туды, плачуць. Падчас вайны ў Чырвоным Беразе быў «апрабаваны» новы метад забору крыві. Дзяцей падвешвалі пад мышкі, сціскалі грудзі, а для таго, каб кроў не зварочвалася, уводзілі спецыяльны раствор. На ступнях рабіліся глыбокія надрэзы. Уся кроў сцякала ў герметычны посуд... Знявечаныя целы фашысты спальвалі... Зараз вядома інфармацыя пра 14 канцлагераў на тэрыторыі Беларусі, дзе ў дзяцей бралі кроў для салдат вермахта...

Асабіста для мяне адкрыццё менавіта аблічча вайны (не дат, не храналогіі) — гэта вяртанне не толькі памяці, але і вяртанне гонару, годнасці. Разумеючы, што перажыў мой народ, пачынаеш больш ім ганарыцца. Ці кожны народ змог бы перажыць такое і не страціць веры ў дабрыню, у людзей, у будучыню? І менавіта не школьныя, а жывыя веды даюць новае адчуванне паняцця Незалежнасць.

Ды і само свята Дзень Незалежнасці набывае іншы сэнс. Шкада толькі, што ўсё гэта мы адкрываем са спазненнем...

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

А ШТО ДУМАЮЦЬ ПРА ПАТРЫЯТЫЗМ НАШЫ МАЛАДЫЯ СУЧАСНІКІ?

Першы сакратар Мінскага абкама БРСМ Валерый ЖАЛЮБЧЫК:

— Пра патрыятычнае выхаванне ў сучасным фармаце можна гаварыць шмат.

Нашы валанцёрскія акцыі — хіба не выхаванне патрыятызму? Маладыя людзі дапамагаюць ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, якія маюць у гэтым патрэбу. Для сталага чалавека важна не толькі тое, што яму пасеклі дровы і прынеслі вады, а яшчэ і тое, што яго выслухалі. Кожны ветэран — гэта скарбніца мудрасці. Сталыя людзі гатовы гадзінамі не адпускаць, каб распавесці пра вайну. У Барысаве ўдзельнікі атрада «Добрае сэрца» падчас паходу сустракаліся з людзьмі, якія памятаюць вайну. Таксама яны вырашылі дайсці да возера Палік, туды, дзе ў час вайны размяшчалася партызанская зона. А гэта непраходныя мясціны, і патрапіць туды вельмі цяжка. Праз падручнікі, праз гучныя словы з трыбун мы не абудзім цікавасць да гісторыі. Моладзі патрэбны сведкі або падрыхтаваныя людзі, якія змогуць данесці звесткі...

Ірына ПЯТРОВІЧ, загадчык аддзела патрыятычнага выхавання Рэспубліканскага цэнтра турызму і краязнаўства навучэнскай моладзі:

— Патрыятызм — філасофскае паняцце. Яно не бывае аднагранным і аднаразовым. Гэта — такое пачуццё, якое тлумачыць адносіны да Радзімы — малой ці вялікай, да краіны, дзе ты нарадзіўся і жывеш, да сваіх продкаў. І гэта адно з тых пачуццяў, якое неабходна выхоўваць: яно само па сабе не ўзнікае. І тут галоўны выхавальнік — у першую чаргу сям'я, а пасля ўжо — школа.

Можна колькі заўгодна казаць, што трэба быць патрыётам. Але ці будзе гэта эфектыўна? Патрэбна стварыць такое асяроддзе, каб гэта пачуццё само прыйшло да чалавека. Зараз, напрыклад, у нас функцыянуе ваенна-патрыятычны лагер. Там дзеці засвойваюць страявую падрыхтоўку, развучваюць ваенна-патрыятычныя песні, сустракаюцца з ветэранамі і ваеннаслужачымі. У падлеткаў нават з'яўляецца жаданне пайсці ў армію!

Я ў сваёй працы неаднойчы сутыкаюся з праявамі патрыятызму. Калі нядаўна ў Польшчы выступаў наш фальклорны калектыў, мы падтрымлівалі іх, трымаючы ў руках беларускія сцягі. І такая добрая ўзнікала энергетыка, што да нас падыходзілі іншаземцы і пыталіся: «Вы з Беларусі?» А мы з гонарам адказвалі: «Так!»

Яўген МАЛЕВІЧ, курсант 4-га артылерыйскага курса агульнавайсковага факультэта Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь:

— Для мяне патрыятызм — любоў да сваёй малой радзімы, дзе я нарадзіўся і вырас, куды мяне заўсёды цягне. А таксама любоў і павага да сваёй краіны, свайго народа. Патрыятызм — свайго роду і эмацыянальнае перажыванне за краіну, пачуццё адказнасці, якое закладваецца ад нараджэння. Калі чалавек выхоўваецца ў грамадстве, а не жыве на бязлюдным востраве, ён адназначна вырасце патрыётам.

Кожная краіна, як і чалавек, індывідуальная. Гэтая індывідуальнасць выяўляецца ў яе культуры, дасягненнях, значнасці ў сусветнай прасторы. У патрыёта заўсёды ёсць гонар у душы за сваю Айчыну, за яе гістарычнае мінулае! Не быць патрыётам — значыць быць бяздомным!

Святлана БЯЛАН, кіраўнік класа ваенна-патрыятычнага кірунку сярэдняй школы № 6, г. Ліда:

— Гатоўнасць у любы момант стаць на абарону сваёй Радзімы, працаваць на карысць Айчыны, рэалізоўваць планы і ідэі ў сваёй краіне — так я разумею значэнне слова «патрыятызм». Безумоўна, гэтыя пачуцці не ўзнікаюць на пустым месцы — іх трэба фарміраваць.

У кожнай навучальнай установе павінны існаваць такія ўмовы і сацыяльныя адносіны, якія спрыялі б выхаванню ў вучняў пачуцця адказнасці за сябе, за сям'ю, за Радзіму. Дзейнасць патрыятычных класаў у нашай школе якраз і скіравана на гэта. Хлопцы і дзяўчаты сустракаюцца з ветэранамі, дапамагаюць ім, наведваюць воінскія часці горада, ваенныя навучальныя ўстановы краіны, удзельнічаюць у валанцёрскім руху.

Дзмітрый САКАЛОЎСКІ, інжынер-энергетык БУ-19 ААТ «Будтрэст №1»:

— Патрыёт — той, хто заўсёды гатовы да абароны сваёй Радзімы. Пачнецца вайна — ён возьме ў рукі зброю, будуць ганьбіць краіну — ён таксама не стане маўчаць. Крыўдна, калі ў жыцці краіны ўзнікаюць пэўныя праблемы, а так званыя «патрыёты» пачынаюць яе ганьбіць і казаць: «Гэта ж Беларусь...». Напрыклад, калі наша краіна не выходзіць у фінал Еўрабачання. Калі ж Беларусь у чымсьці становіцца першай, тады колькасць патрыётаў расце хутка!

Патрыятызм — пачуццё, якое або ёсць, або няма. А «выхаваць» яго немагчыма. Знаходзячыся за мяжой, я не цураюся казаць, што прыехаў з маленькай краіны, якая знаходзіцца амаль у цэнтры Еўропы. Я заўсёды сачу за беларускімі футбольнымі камандамі, перажываю за іх, веру, што самая галоўная перамога яшчэ наперадзе. Я не саромеюся гаварыць па-беларуску! Валоданне роднай мовай і ўжыванне яе ў паўсядзённым жыцці — гэта таксама праява патрыятызму.

Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ, пісьменніца, настаўніца Ждановіцкай сярэдняй школы:

Патрыятызм — гэта складанае пачуццё. Патрыётамі не нараджаюцца — імі становяцца. Я лічу, што патрыятызм пачынаецца з сям'і. Калі яшчэ ў дзяцінстве бацькі заклалі ў душу маленькага чалавека любоў да Радзімы, ён пранясе яе праз усё сваё жыццё.

Я пішу творы для дзяцей, працую настаўніцай у школе і выхоўваю васьмігадовага сына Станіслава. Ён любіць родную мову, чытае беларускія кнігі. Уся наша сям'я — хакейныя заўзятары: мы рэгулярна наведваем матчы на «Мінск-Арэне». Разам спяваем гімн, горача падтрымліваем нашу каманду пры любым выніку гульні.

Як педагог я імкнуся зрабіць так, каб кожны вучань зразумеў, што яго малая радзіма — толькі часцінка велізарнага агульнага дома, грамадзянінам якога ён з'яўляецца. І нягледзячы на тое, што гэтыя часцінкі розныя, часам не падобныя адна на адну, усе яны, разам узятыя, і з'яўляюцца нашай Радзімай.

Аднак, выхоўваючы ў дзецях патрыятызм, не трэба кідацца ў крайнасці. Не той патрыёт, хто крычыць па ўсіх вуглах, як моцна ён любіць Радзіму, а той, хто разам з вартасцямі сваёй Радзімы бачыць і яе недахопы, і дапамагае ёй ад іх пазбавіцца ў меру сваіх сіл і здольнасцяў.

Падрыхтавалі Алена ДЗЯДЗЮЛЯ і Вераніка КАНЮТА.

Запрашаем далучыцца да дыялогу нашых чытачоў. Што вы разумееце пад патрыятызмам?

Фестывалі

ДУША Ў КУФРЫ

Чаму «Зацюканы апостал» Макаёнка паехаў у Эстонію?

2 ліпеня ў Мінску распачаўся IX Міжнародны фестываль студэнцкіх тэатраў «Тэатральны куфар-2012». Сёлета фестываль праходзіць у рамках IX Сусветнага кангрэса Міжнароднай асацыяцыі ўніверсітэцкіх тэатраў, таму мае незвычайны для аматараў фэсту фармат.

Упершыню за дзевяць гадоў узнагароду атрымае толькі адзін калектыў: пераможцу будзе вызначаць глядацкае журы, якое традыцыйна ацэньвае па дзесяцібальнай шкале спектаклі пасля прагляду. І ацэньваць сапраўды ёсць што, бо «Куфар-2012» прымае гасцей з Расіі, Украіны, Літвы, Грузіі, Кітая, ЗША, Уругвая, Балгарыі, Францыі, Філіпінаў. З 70 спектакляў для фестывальнай праграмы было адабрана толькі 13.

Нашу краіну прадставіў тэатр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта «На балконе» з беларускамоўнай пастаноўкай «Кругі» паводле п'есы Уладзіміра Боські.

Увогуле, удзельнікі фестывалю прывезлі даволі разнастайны матэрыял: класічная кітайская п'еса Цао Юя «Сям'я», іспанскамоўная версія «Злачынства і пакарання» з акцэнтам на справядлівым правасуддзі, «Пагавары са мной» Тэнесі Уільямса ў сучаснай музычна-пластычнай інтэрпрэтацыі, «Містэрыя кахання», пастаўленая па вершах паэтаў розных часоў і народаў, шэкспіраўскі «Гамлет» з вырашэннем пытання, як забіць «ген Гамлета» ў чалавецтве, «Музей» паводле твораў сучаснага французскага сцэнарыста Жана-Мішэля Рыбэ, «Вечар з Чэхавым» па агульнавядомых п'есах «Іваноў», «Мядзведзь», «Прапанова», «Дзядзя Ваня» і «Вішнёвы сад», танцавальна-песеннае «Чыстае каханне» па матывах «Рамэа і Джульеты», аўтарскі праект «Ілюзіён» з усімі «зоркамі» Галівуда.

— Самы душэўны фестываль, — так акрэсліла дзявяты «Тэатральны куфар» яго **дырэктар Кацярына САЛАДУХА**. — Мы не эстраднае шоу і не прафесійнае мерапрыемства, а менавіта тое мерапрыемства, дзе акцёр-студэнт і глядач-студэнт могуць пагутарыць па душах. Не заўжды, магчыма, вербальна разумеючы адзін аднаго, але заўжды разумеючы эмацыйна.

А як інакш, калі большасць спектакляў ідзе на роднай мове калектыву-ўдзельніка, што на думку арганізатараў «Тэатральнага куфара» падкрэслівае ўнікальнасць кожнай нацыі.

Менавіта дзякуючы беларускаму фестывалю, які лічыцца адным з лепшых у Еўропе, Мінск упершыню прымае такое масштабнае тэатральнае мерапрыемства, як IX Сусветны кангрэс Міжнароднай асацыяцыі ўніверсітэцкіх тэатраў. Таму на «Тэатральны куфар» завіталі шматлікія знаныя госці з усяго свету: Тобіас Б'янконе, генеральны сакратар Міжнароднага інстытута тэатра ЮНЕСКА, Павел Руднеў, расійскі тэатральны крытык, Жан-Марк Лару, прэзідэнт Міжнароднай асацыяцыі ўніверсітэцкіх тэатраў, Ірына Кружыліна, майстар па касцюмах з ЗША, і іншыя.

Своеасаблівай навінкай сёлетнега фэсту стаў спецыяльны праект «Па кім звоніць звон», прысвечаны Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

Гледачы змаглі пабачыць два спектаклі паводле ўспамінаў вязняў канцэнтрацыйных лагераў — «Без назвы» эксперыментальнай лабараторыі БДУ «ТэатральнЫ квадрат» і «Планета попел» грузінскага Тэатра ўніверсітэта Ільі. Апошні пастаўлены паводле ўспамінаў драматурга Дэвіда Зейна Мейровіца рэжысёрам Іракліем Гогія, таму цікава, што можна было параўнаць погляд прадстаўнікоў розных народаў на адну і тую ж вайну. Але гэтыя дзве пастаноўкі не ўваходзяць у конкурсную праграму.

Варта таксама адзначыць, што насамрэч фестываль пачаўся яшчэ ў лютым, калі ў рамках праекта Koufar-to-Stage рэжысёр тэатра БДУ «На балконе» Сяргей Турбан паставіў у Тартускім універсітэце «Зацюканага апостала» Андрэя Макаёнка. А эстонскі рэжысёр разам з нашымі акцёрамі паставіў спектакль «Зачыненыя дзверы» па п'есе сучаснага беларускага драматурга Паўла Пражко.

Зараз жа мінчане маюць магчымасць паглядзець на вынікі іншых творчых эксперыментаў. Уваход на спектаклі, як і ў мінулым годзе, платны — 23 тысячы беларускіх рублёў. Але квіток на «Куфар» — унікальная магчымасць у душэўнай фестывальнай атмасферы пазнаёміцца з моладзевымі тэатральнымі рухамі свету. Да закрыцця фестывалю засталося літаральна два дні, але яшчэ можна паспець «апынуцца» ў Францыі, Балгарыі, Літве, на Філіпінах ці ў Расіі. І нават дапамагчы вызначыць, хто ж атрымае Гран-пры.

Вераніка МОЛАКАВА.

«...ТАМУ Я — МУЖЧЫНА!»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Ці стала дзяўчат-прыхільніц больш?

— Несумненна. У мяне такая прафесія, што дзяўчаты акружаюць пастаянна. У інстытуце таксама — зразумела, эстраднае аддзяленне — дзяўчаты вельмі прыгожыя. Але хочацца ўжо іншага — нечага больш сур'ёзнага. У такім узросце ўсё «цік-цік-цік» — і прайшло. А хочацца асэнсаваць сябе з іншага боку.

— Якія дзяўчаты табе падабаюцца?

— Не буду хітрыць — падабаюцца прыгожыя дзяўчаты, якія сочаць за сабой. Па характары? Я не скажу, што магу закахацца «за нешта». Пэўна, гэта адбываецца ў сілу фактару «х». Ты ўбачыў дзяўчыну, зляцеў «з катушак» і прымаеш яе такой, якая яна ёсць, з усімі недахопамі і добрымі якасцямі.

— А чым, на тваю думку, ты іх прывабліваеш? У чым твой моцны мужчынскі бок?

— Не ведаю, ці карэктна так казаць, але мужчыны зараз... крыху пайшлі ў бок жанчын — у адзенні, у манеры паводзін, сталі больш мяккімі. І нешта ў такіх адштурхоўвае. Пэўна, мае адметныя мужчынскія якасці — гэта прыстойнасць, добрае стаўленне да дзяўчыны.

— Каб лёс не звёў цябе з прадзюсарскім цэнтрам «Спамаш», якім шляхам ішло б тваё развіццё як эстраднага выканаўцы?

— Мне здаецца, што ўсё ў жыцці ўзаемазвязана. Калі ты працуеш, шмат аддаеш пры гэтым сілы, энергіі, вучышся, траціш свае грошы на любімую справу, то ўсё абавязкова складзецца. Я не перастаю здзіўляцца доказам гэтай тэарэмы: калі ты нечага хочаш, то табе нечакана аднекуль яно пастаянна прыходзіць. Напрыклад, пайшоў на праслухоўванне, спадабаўся там, узялі, падпісалі кантракт, падалі заяўку, едзеш на «Славянскі базар» — вось яно!

Бывае, нічога не ўдаецца, адбываецца не так, але ты ўсё роўна мэтанакіравана рухаешся, і ў канчатковым выніку вымалёўваюцца нейкія дзверы — адчыняй, ідзі. Таму я не магу сказаць, што было б, «калі б не...» — гэта быў бы ўжо зусім іншы Жэня, але ён, несумненна, заставаўся б музыкантам. Гэта маё, я так адчуваю і нікуды не адыду ад гэтага шляху, што б ні адбылося.

— Нашы чытачы пакуль цябе мала ведаюць, хаця хутка, безумоўна, пачуюць усе. Як бы ты апісаў свой сцэнічны вобраз, які ты?

— Мужчын на сцэне не хапае, таму я — мужчына. Збольшага я лірык, які спявае жаночай палове пра свае пачуцці.

— Ты казаў пра музыкаў, у якіх варта павучыцца...

— Мне падабаецца Адам Ламберт — зараз ён на піку папулярнасці, у яго моцны вакал і выдатнейшая музыка. Поп-класіка — гэта Андрыа Бачэлі, Джорж Громан, Уітні Х'юстан. Мне падабаюцца таксама Крысціна Агілера, Майкл Бублей і многія іншыя.

— Распавядзі, хто ты і які, акрамя таго, што музыка і спявак?

— Я спакойны, ураўнаважаны чалавек, пастаянна працую. Люблю забаўляцца, хадзіць у басейн, займацца вольнай барацьбой, цяжкай атлетыкай. Люблю сустракацца з дзяўчатамі. У любым выпадку, мой графік насычаны, Што б я ні рабіў, мне пастаянна трэба некуды бегчы, нечым займацца — проста сядзець на месцы я не магу.

— Што ты будзеш рабіць, калі не пераможаш на «Славянскім базары»?

— Нікому не хочацца казаць пра «не перамогу», кожны хоча быць першым. Але калі нават нешта не атрымаецца, гэта будзе вопыт. З'явіцца магчымасць убачыць свае слабыя бакі, а калі яны ёсць — значыць, ёсць да чаго імкнуцца і над чым працаваць. Вядома, хочацца перамагчы — для гэтага робіцца ўсё. Хочацца пажадаць удачы сваім супернікам, хаця іх так складана назваць, бо ўсе мы робім адну справу. Але пераможа той, хто добра папрацаваў у свой час, каму пашанцуе і хто справіцца з хваляваннем.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

ДЗЕ ЦЯПЕР БЕЛАРУСЫ — ПЕРАМОЖЦЫ «СЛАВЯНСКАГА БАЗАРА»?

Сёлета конкурс маладых выканаўцаў у Віцебску адбудзецца — страшна сказаць — у дваццаць першы раз! Але перад тым, як пажадаць удачы на фестывальнай сцэне чарговаму прадстаўніку Беларусі, мы палічылі лагічным пацікавіцца лёсам нашых мінулых пераможцаў. Тым больш, каб іх узгадаць, хопіць пальцаў адной рукі...

2003 год

Максім САПАЦЬКОЎ

Артыст Гомельскай абласной філармоніі стаў першым з беларусаў, хто праз дзесяць гадоў з моманту заснавання фэсту ўзяў нарэшце Гран-пры «Славянскага базара ў Віцебску», а адначасова — і прыз глядацкіх сімпатый.

Прызавыя грошы, як прызнаўся некалькі гадоў таму прадбачлівы артыст, ён адклаў на пэўны час — і як знайшоў крыху пазней для старту R'n'B-кар'еры. Пасля перамогі і гадавой «адпрацоўкі» на афіцыйных мерапрыемствах спявак пачаў шчыльнае супрацоўніцтва з рэперам Сярогам, стаўшы больш запатрабаваным у Кіеве і Маскве, чым у родных мясцінах. У 2008 годзе выпусціў дэбютны альбом, годам пазней прадстаўляў Беларусь на «Новай хвалі» ў Юрмале, але вышэй за 10 месца падняцца не здолеў. Таксама ўваходзіў у фінал расійскага адбору на «Еўрабачанне-2008», актыўна ўдзельнічаў у некалькіх кінапраектах, запісаў міжнародны дуэт з французскай спявачкай Anggun.

На момант здачы матэрыялу ў нумар звязацца з Максам Лорэнсам — пад гэтым псеўданімам артыст цяпер больш вядомы суайчыннікам — не ўдалося. Але ўдалося высветліць, што «надзея рускага R'n'B» не сядзіць на месцы, а актыўна гастралюе, здымаецца ў тэлешоу і пачуваецца вельмі няблага.

Што паслухаць: выдаў 1 дэбютны альбом, выступаў бэк-вакалістам практычна ва ўсіх альбомах рэпера Сярогі.

У праграме «Славянскага базара-2012» не заяўлены.

2004 год

Пётр ЕЛФІМАЎ

Не ведаю, у каго як, а асабіста ў мяне дагэтуль бягуць мурашы па спіне ад елфімаўскай версіі песні Чэслава Немена «Гэты дзіўны свет». Перакананая, што гэта быў адзін з нямногіх разоў, калі Гран-пры віцебскага конкурсу быў прысуджаны бясспрэчна і адназначна.

Самым значным выдаткам з прызавых грошай для артыста стала куплянне сучаснага камп'ютара — «на той момант ён проста «лятаў» і быў абсалютна неабходны для працы». Пасля перамогі Пётр ніколькі не «злавіў зорку», без залішняй паспешлівасці скончыў кансерваторыю, яшчэ праз пару гадоў сам стаў выкладаць эстрадны вакал у адной са сталічных ВНУ. У 2009 годзе не вельмі ўдала прадстаўляў Беларусь на «Еўрабачанні», затое ўжо праз год у Галівудзе на сусветным чэмпіянаце выканаўчых мастацтваў узяў 5 залатых медалёў.

«Я і цяпер нікуды не знік, — смяецца Пётр. — Спяваю, выкладаю, пішу музыку, гастралюю па краіне і за яе межамі. Нарэшце, новы сольны альбом выдаў, «Адкрыццё» — канцэптуальны і аўтабіяграфічны. Гэта будзе знаёмы слухачам, але месцамі нечаканы Елфімаў».

Ужо не першы год ходзяць размовы аб тым, што конкурс маладых выканаўцаў у цяперашнім выглядзе састарэў і яму трэба змяняць фармат. Але ўладальнік віцебскага Гран-пры-2004 з гэтым катэгарычна не згодны: «На мой погляд, конкурс заўжды быў адным з галоўных мерапрыемстваў, дзеля якіх і ствараўся «Славянскі базар». Дзякуючы менавіта конкурсу маладых выканаўцаў наш фестываль ведаюць ва ўсім свеце як мерапрыемства вельмі высокага ўзроўню. Таму, лічу, трэба даражыць тым, што ў нас ёсць і захоўваць свой «твар», а не захапляцца пастаноўкай шоу, інакш атрымаецца падобна да «Новай хвалі» ці іншых конкурсаў. Наша ж задача — не замазаць недахопы і расфарбаваць прывабнасці выканаўцы, а ацаніць яго такім, які ён ёсць — харызма, талент, абаянне. Паглядзім, якім атрымаецца конкурс сёлета, але, спадзяюся, найлепшыя свае рысы і прафесіяналізм ён захавае».

Што паслухаць: Запісаў 3 альбомы, ужо гатовы 4-ы, першая прэзентацыя якога адбудзецца на пачатку верасня ў Маладзечне.

У праграме «Славянскага базара-2012» выступіць на адкрыцці фэсту і ў Дні Беларусі, 12 і 14 ліпеня.

2005 год

Паліна СМОЛАВА

Дзяўчынка ў валошкавым вяночку — такой запомнілася Паліна Смолава на віцебскім конкурсе. З істотным дадаткам — вельмі, вельмі галасістая дзяўчынка. На фэсце ўпершыню выявілася канкурэнцыя дзвюх спявачак (Паліны Смолавай і Гюнеш Абасавай), якая ў наступныя гады толькі ўзмацнялася.

Грашовую частку Гран-пры, як ужо не раз узгадвала спявачка, яна здала на захаванне ў надзейны сейф — бацьку. «Інакш бы ўсё растраціла. А так ад сумы, што засталася пасля выплаты падаткаў, брала толькі на самае патрэбнае — на запіс песень. Нават канцэртныя касцюмы набывала з іншых даходаў».

У 2006 годзе ўдзельнічала ў «Еўрабачанні» (зноў абышоўшы Гюнеш на адборы), але паказала адзін з найгоршых для Беларусі вынікаў. Затое на конкурсе «Новая хваля-2007» спявачка стала лепшай з беларускіх артыстаў, заняўшы 4-е месца нароўні з казахскім гуртам Rin'Go. Праз год артыстка з'ехала жыць і працаваць у Маскву, адкуль рэгулярна эпаціравала землякоў — то супрацоўніцтвам з вядомым бізнэсменам Віктарам Батурыным, то сумесным запісам са знакамітым сэрам Полам Макартні (апошняя інфармацыя, праўда, аказалася «вуткай»). Цяпер, мяркуе Паліна, яе галоўная задача — не знікаць з далягляду і рабіць усё, каб пра спявачку Паліну Смолаву «гаварылі не толькі ў Мінску і Маскве, але і далей. Галоўнае — не стаяць на месцы, а ўвесь час рухацца!». Плён гэткай актыўнасці відавочны: двойчы — у 2008 і 2012 годзе — спявачка праходзіла ў фінал расійскага адборачнага туру конкурсу «Еўрабачанне».

Што паслухаць: Выпусціла 3 альбомы, працуе над чацвёртым, у якім выступае ў якасці як спявачкі, так і аўтара ўсіх песень.

У праграме «Славянскага базара-2012» Паліна Смолава выступіць у гала-канцэрце майстроў мастацтваў Беларусі 14 ліпеня.

2011 год

Алена ЛАНСКАЯ

Зямлячка Пятра Елфімава, магіляўчанка Алена Ляпохіна (сапраўднае прозвішча спявачкі) спрабавала выйсці на вялікі эстрадны гасцінец некалькі разоў. Першы — пад сцэнічным імем Валошка, з беларускамоўным рэпертуарам; псеўданім не прыжыўся, а вось адна з песень «Белая ластаўка» праз 6 гадоў «стрэліла» на «Славянскім базары ў Віцебску» і прынесла выканаўцы перамогу.

Галавакружэнне ад поспехаў Алене пераносіць не было калі. Яна ўвесь год навідавоку: неўзабаве пасля конкурсу стала самай маладой у краіне заслужанай артысткай, потым прайшла экспрэс-курс «маладога байца эстраднага фронту» ў праекце «Еўрафэст». І хоць пасля шэрагу разбіральніцтваў перамога Ланской была анулявана, на «Еўрабачанне» артыстка ўсё ж трапіла, няхай сабе і ў гасцявым статусе, але пабывала за кулісамі конкурсу, набралася вопыту і не ўтойвае, што будзе не супраць паспрабаваць прабіцца на еўрапейскую сцэну яшчэ раз — ужо ў якасці афіцыйнага прадстаўніка Беларусі.

Што паслухаць: дэбютны альбом «Лабірынты лёсу», запісаны яшчэ ў 2010-м. Наступны , як анансавала спявачка, запісваецца ў Лондане і павінен быць цалкам англамоўным.

У праграме «Славянскага базара-2012» спявачка выступіць на канцэрце адкрыцця фэсту 12 ліпеня.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота Анатоля КЛЕШЧУКА і з інтэрнэту.

МУЗЫЧНАЯ МАТЭМАТЫКА

❍ *Да 2002 года ўключна краіны-заснавальніцы фестывалю — Беларусь, Расію і Украіну — маглі прадстаўляць па 2 удзельнікі, потым — па 1. Уласна, з таго моманту беларускім выканаўцам і пачало шанцаваць.*

❍ *Вышыня занятага месца ніяк не суадносіцца з далейшай папулярнасцю артыста. Да прыкладу, Іна Афанасьева і Аляксей Хлястоў у далёкім ужо 1992 годзе падзялілі з расіянкай Сабінай II прэмію, у 2002 годзе Наталля Падольская таксама падзяліла III месца з расіянкай Аленай Гуляевай, а Віталь Гардзей у 2008 годзе стаяў з расіянкай Ленай Валеўскай на 1-м месцы. Тым не менш першая з названых — цяпер заслужаная артыстка Беларусі, другі прабіў для суайчыннікаў шлях на папулярны конкурс «Новая хваля», трэцяя стала сваёй у тусоўцы расійскіх эстрадных «зорак», а вось у апошняга музычная кар'ера ў Маскве не заладзілася, дый пасля вяртання на радзіму, на жаль, яго не вельмі чуваць.*

❍ *Найвялікшы ў гісторыі конкурсу маладых выканаўцаў Гран-пры — 15.000 долараў — быў уручаны летась Алене Ланской. Сума грашовага прыза папярэдніх пераможцаў складала 10.000 долараў.*

ПЛЮС АДЗІН

Дарэчы, амаль што беларускім можна лічыць Гран-пры Дзмітрыя Даніленкі ў 2009-м. Ураджэнец Гомеля атрымаў расійскае грамадзянства ўсяго толькі за пару месяцаў да конкурсу. І хоць яго трыумф дагэтуль мае вельмі спрэчнае адценне, але — пераможцаў не судзяць...

Пасля перамогі спявак скончыў Расійскую дзяржаўную кансерваторыю ў Санкт-Пецярбургу (цяпер працуе на атрыманне ступені магістра) і пайшоў па шляху класічнай музыкі — нездарма яшчэ на «базары» хлопца параўноўвалі з Мікалаем Баскавым як вонкава, так і па рэпертуары. Тэнар беларуса гучаў на лепшых пляцоўках Санкт-Пецярбурга і Масквы — у Крамлі і Марыінскім тэатры. Зрэшты, паралельна спявак працуе над альбомам танцавальнай музыкі, які напярэдадні новага 2013 года павінен выйсці ў Нью-Ёрку.

Вундэркіндамі становяцца!

ПА СІСТЭМЕ ДАЛІНСКАГА

Здаецца, выкладчыку спецкурса па інфарматыцы Міхаілу Далінскаму сёння не патрэбны асаблівыя рэкамендацыі. Калі пачаць пералічваць усе тытулы яго і яго вучняў, не хопіць месца ў газеце. Таму сухія лічбы. Гомельская вобласць на міжнародных алімпіядах па інфарматыцы (IOI) за 15 гадоў удзелу атрымала 23 медалі рознай вартасці. Для параўнання: у Мінскай вобласці, якая на другім месцы, — 10 узнагарод. Юны кап'ютарны геній Генадзь Караткевіч, які мае тытул трохразовага чэмпіёна свету па праграмаванні сярод школьнікаў, а нядаўна ўдастоены звання «Чалавек года Гомельшчыны», рабіў першыя крокі ў вучэбным класе Міхаіла Далінскага. Дарэчы, яшчэ ў другім класе юнак паказаў вынікі, якія дазвалялі яму перасесці на студэнцкую лаву. Сам Міхаіл Сямёнавіч, які калісьці пачаў выкладаць толькі таму, што патрэбны былі калегі-праграмісты, так уцягнуўся ў гэтую справу, што стаў абсалютным аўтарытэтам у свеце навучання праграмаванню з першага класа. Між іншым, сёння ўніверсітэцкі выкладчык жартуе, што дзіця можна навучыць праграмаваць раней, чым чытаць. Серада і нядзеля — дні, калі Далінскі займаецца з дзецьмі ў школе № 27 Гомеля, і менавіта тут ён прызначыў мне спатканне.

— З пяцікласнікамі я пачаў працаваць у 2007 годзе, 4 вучні тады адначасова прыйшлі: Вова Міняйлаў, Сяргей Вераксіч, Саша Грамыка і Вова Шлягроўскі. Яны ўсе аднолькава добра займаліся. Але ж вынікі былі розныя. Уладзімір Міняйлаў зараз заканчвае Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт, а яшчэ школьнікам ён тройчы стаў прызёрам міжнародных алімпіяд. Двое заканчваюць Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт. Пры гэтым Сяргей Вераксіч яшчэ ў 7 класе трапіў на рэспубліканскую алімпіяду. А Саша Грамыка толькі ў 10 класе выступіў «на рэспубліцы», узяў дыплом і паступіў ва ўніверсітэт без экзаменаў. Чацвёрты — Вова Шлягроўскі — толькі ў 11 класе першы раз трапіў на рэспубліканскую алімпіяду, але дыплом узяць не здолеў... Я стаў думаць: яны ж аднолькава добра і шмат займаюцца, а вынікі розныя.

— Здольнасці і ад прыроды ў людзей розныя, і натуральнага адбору ніхто не адмяняў...

— Так. Калісьці я працаваў на вучэбна-вытворчым камбінаце. Заяву прынеслі 75 чалавек, а трэба было набраць 25. Тады напісаў на дошцы тэкст на мове праграмавання — гэта 10 радкоў. І даў заданне: хто перапіша першы і без памылак, той залічваецца. Калі ж будзе хаця б адна памылка, можна паспрабаваць перапісаць нанова, а можна пакінуць клас... Са здзіўленнем для сябе выявіў, што адны дзеці за 15 хвілін напісалі, а іншым і 45 было мала. Сёння аналагічны прыём я выкарыстоўваю з першакурснікамі на ўводных занятках. Даецца 10 задач, якія дазваляюць зразумець тэхналогію — як працаваць ва ўніверсітэцкай прасторы. І зноў вялізная розніца ў часе выканання, а значыць, у спосабе мыслення. Адны маюць навыкі думаць, а іншыя — не. Я паспрабаваў разбіць навучанне на нейкія кампаненты і трэніраваць па-асобку розныя разумовыя аперацыі — напрыклад, параўнанне, аналогію, уяўленне, аналіз, сінтэз, абстракцыю... Мы паспрабавалі рабіць такія заданні, якія працуюць на гэта. Усе практыкаванні пабудаваны мэтанакіравана. Для тых, хто не ўмее чытаць, — 3 узроўні складанасці. Увогуле ж сістэма навучання пяціўзроўневая.

— Маглі б намаляваць партрэт вашага тыповага вучня?

— Сотні прыходзяць займацца, дзясяткі застаюцца. Тыя, хто тут пастаянна, можна лічыць, ужо вырашылі свае прафесійныя праблемы: яны паступяць у ВНУ, атрымаюць спецыяльнасць, будуць мець добры заробак. Прыходзяць дзеці інтэлігентаў у асноўным, але ж ёсць і іншыя прыклады. У гэтым сіла сістэмы: працуй, варушы мазгамі — і паднімешся на вышыню. Аднак тых, хто хоча працаваць, сёння ўсё менш і менш. Калісьці ў класе стаяла 8 камп'ютараў, а прыходзіла займацца 30 чалавек. А цяпер наадварот: 30 камп'ютараў на 8 чалавек. (Насамрэч у класе не менш за 2 дзясяткі дзяцей рознага ўзросту. — **Аўт.**) Я пайшоў да малодшых у тым ліку і таму, што старэйшыя ўжо не хочуць займацца. Ёсць і іншая праблема: уменне пераадольваць самога сябе. Якім бы геніем вучань ні быў у сваім школьным класе, у нашай аўдыторыі ён вельмі хутка даходзіць да таго моманту, калі становіцца цяжка. І тады трэба асвойваць нешта новае, напружвацца, пераадольваць сябе.

— Міхаіл Сямёнавіч, ці працуе ваша сістэма са студэнтамі?

— Вучыцца я прымушаю ўсіх. Імкнуся і лекцыі, і практычныя заняткі арганізаваць такім чынам, каб стварыць умовы для росту. Важна, каб людзі займаліся і рабілі тое, што ім цікава. Натуральна, як любому выкладчыку, мне падабаецца, калі студэнт задае нейкія разумныя пытанні, але ж на адзнаку гэта не ўплывае. Я прэтэндую на тое, каб на мае заняткі хадзілі і каб у аўдыторыі была цішыня. А адзнакі студэнты атрымліваюць аўтаматычна падчас семестра: на лекцыях і на практычных занятках, таксама ёсць індывідуальныя заданні. Я прапаноўваю студэнтам складаць новыя задачы, тэсты. Ёсць у мяне і сістэма спецыяльных бонусаў. Вось з гэтых складнікаў і фарміруецца канчатковая ацэнка ведаў. Зараз у студэнцкіх аўдыторыях сталі дамінаваць студэнты-«платнікі». Часта яны не вельмі хочуць вучыцца, але ж мае прынцыпы распаўсюджваюцца і на іх.

— Ці шмат сваіх вучняў вы працягваеце вучыць у ГДУ імя Ф. Скарыны? Або яны аддаюць перавагу іншым, больш прэстыжным ВНУ?

— Безумоўна, вучацца і ў Гомелі. Многія паступаюць у БДУ на факультэт прыкладной матэматыкі. З некаторага часу нашы выпускнікі пратапталі дарожку ў БДУІР (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі). Ёсць асобныя, якія аддаюць перавагу ўніверсітэту інфармацыйных тэхналогій і дакладнай механікі і оптыкі ў Санкт-Пецярбургу, дзе з 1997 года праводзяць паўфінал студэнцкага камандnага першынства свету па праграмаванні, а таксама камандnае першынство сярод школьнікаў былога СССР. Ёсць сведкі, што Гена Караткевіч менавіта туды падаў дакументы для залічэння. У Маскоўскім дзяржаўным універсітэце і Маскоўскім фізіка-тэхнічным інстытуце таксама нашы вучацца...

— Ці ёсць прыклады, што яны вяртаюцца дадому?

— З тых, хто ад'ехаў, я не бачыў ніводнага, хто вярнуўся. Прынамсі, ёсць нашы выпускнікі, якія працуюць у Intel, Google,... Але ж ёсць Арцём Кузняцоў — першы гамяльчанін, які стаў чэмпіёнам рэспублікі ў 1997 годзе. Потым ён стаў сярэбраным прызёрам міжнароднай алімпіяды па інфарматыцы. Дарэчы, Арцём стаў і першым распрацоўшчыкам сістэмы дыстанцыйнага навучання. Ён вучыўся ў Гомелі, потым знайшоў працу ў Маскве — займаўся мабільным банкінгам. Хутка стаў там кіраўніком аддзела распрацоўкі, а сам аддзел перавёў у Гомель. Зараз тут пад яго кіраўніцтвам вялікая колькасць спецыялістаў, якія жывуць у Гомелі, але атрымліваюць практычна маскоўскую зарплату. Цяпер іншая праблема ўзнікла: у нас няма столькі людзей, каб задаволіць усе іх вакансіі. Таму ўзнікла канкурэнцыя, і фірмы пачалі адна ў адной пераманьваць спецыялістаў. Памятаеце, была такая фраза: «Кольт ураўноўвае шанцы»? Цяпер можна сказаць аналагічнае пра інтэрнэт. Той жа Гена Караткевіч — лепшы прыклад. Ён стаў лепшым на планеце, знаходзячыся ў Гомелі. Таму што сёння можна ў любым месцы атрымаць любую інфармацыю — трэба толькі працаваць. І калі ёсць пэўнае асяроддзе, як у нас, магчыма, гэта хутчэй атрымаецца. Між тым, калі ў афрыканскіх краінах своеасаблівым сацыяльным ліфтам з'яўляецца спорт, то ў нас — праграмаванне. Але ж я б назваў гэта, хутчэй, сацыяльнай лесвіцай. Тут трэба прайсці сваімі нагамі, каб забрацца на пэўную вышыню. І, калі праводзіць аналогію далей, я гэтую лесвіцу будую — разам са сваімі студэнтамі, аспірантамі... І мэта — каб яна была як мага вышэйшай.

— Спартыўнае праграміраванне вышэйшага ўзроўню — гэта ж не толькі мазгі, веды і працаздольнасць. Неабходныя пэўныя псіхалагічныя якасці?

— Былі прыклады, калі вучань паказваў вельмі добрыя вынікі дома, але на спаборніцтвах у яго нічога не атрымлівалася. Напрыклад, таму, што напярэдадні не змог заснуць. Адзін са сродкаў вырашэння гэтай праблемы — пачынаць удзельнічаць у спаборніцтвах з малодшага ўзросту. Трэба трапляць у стрэсавы стан шмат разоў, каб паступова перастаць хвалявацца. Карысна, што ў рэальных спаборніцтвах удзельнікі атрымліваюць не толькі станоўчы, але і адмоўны вопыт, вучацца спраўляцца з эмоцыямі. Гена Караткевіч з другога класа ездзіў на алімпіяды, і я ўвогуле не бачыў, каб ён чаго-небудзь баяўся. Быў выпадак, калі Генадзь выйграў абласную алімпіяду з тэмпературай пад 40. Многія потым казалі: гэта ён з тэмпературай так усіх абышоў, а калі б быў здаровы?

— Праграміст у стэрэатыпным успрыманні многіх — чалавек, мала прыстасаваны да рэальнага жыцця, які размаўляе на нейкай жудаснай мове...

— Такое сапраўды здараецца. Але ж гэта пытанні асабістай культуры, што, на маю думку, датычыцца не толькі праграмістаў. А ўплываць на выхаванне складана. Толькі, калі чалавек гатовы ўспрымаць цябе як асобу. Медыкі гавораць: «Не нашкодзь».

СЕМ «КРАЕВУГОЛЬНЫХ КАМЯНЁЎ» СІСТЭМЫ МІХАІЛА ДАЛІНСКАГА, або безумоўныя прынцыпы арганізацыі вучэбнага працэсу

✓**Пастаянства.** Заняткі са школьнікамі па серадах і нядзелях не могуць быць адменены ні ў якім выпадку, а калі я адсутнічаю, мяне замяняе хтосьці іншы.

✓**Усеахопнасць.** Я не адмаўляю нікому з тых школьнікаў, хто прыходзіць. Прыйшоў і хочаш вучыцца — вучыся. Дарэчы, сёння гэта могуць быць не толькі першакласнікі, але і дашкаляты.

✓ **Эфектыўнасць.** Галоўны крытэрый эфектыўнасці — каэфіцыент выкарыстання вучэбнага часу. Я імкнуся да таго, каб на кожным занятку кожную хвіліну працаваў кожны вучань — на межы сваіх магчымасцяў: замацоўваючы атрыманыя навыкі або спасцігаючы нешта новае.

✓ **Індывідуальнасць.** Эфектыўнасці можна дасягнуць толькі пры індывідуальным або дыферэнцаваным навучанні. Гэта азначае, што кожны рухаецца па вучэбным матэрыяле з уласным тэмпам і, адпаведна, у адзін момант часу навучэнцы могуць знаходзіцца ў зусім розных кропках вучэбнага маршруту.

✓**Самастойнасць.** Зразумела, што індывідуальнасць навучання можа быць дасягнута толькі пры ўмове самастойнасці навучання кожнага. Адзін настаўнік не можа фізічна непасрэдна навучаць (растлумачваць, слухаць...) усіх вучняў адначасова, тым больш калі яны працуюць з розным вучэбным матэрыялам.

✓**Аптымальнасць (падбору матэрыялу).** Спрабую падабраць найбольш карысны для вывучэння матэрыял і пабудаваць яго вывучэнне ў найбольш эфектыўную сістэму. Імкнуся сёння вучыць лепш, чым учора, а заўтра — лепш, чым сёння.

✓**Патрабавальнасць да выканання правілаў.** Гэта цішыня ў аўдыторыі, наяўнасць сшытка і ручкі, прыход і сыход у вызначаны час і, зразумела, не хлусіць, а самому выконваць задачы.

Студэнты мінскіх ВНУ Дзмітрый Багданаў, Юрый Брукаў, Аляксей Ропан (у складзе каманд БДУ і БДУІР), якія родам з Гомельшчыны, зусім нядаўна сталі прызёрамі студэнцкай алімпіяды 2012 года па праграмаванні пад эгідай ACM (Association for Computing Machinery) у Варшаве. У іх прымалі ўдзел каля 100 мацнейшых каманд універсітэтаў з усяго свету. Свайму першаму настаўніку, Міхаілу Далінскаму, Дзмітрый даслаў электронны ліст, дзе, акрамя іншага, напісаў: «Магу парэкамендаваць будучым пакаленням, збіраючы каманду, думаць аб псіхалагічнай сумяшчальнасці і аб разнастайных здольнасцях удзельнікаў. Гэта асабліва дае плён на спаборніцтвах. Наш вынік не быў бы магчымы без працы Міхаіла Сямёнавіча Далінскага, Анжалікі Іванаўны Лапо, Уладзіміра Міхайлавіча Котава, парад Лёшы Тоўсцікава і падтрымкі вельмі многіх людзей. Дзякую ад каманды ўсім гэтым людзям. Наш медаль — гэта і ваш медаль».

Калі я не ўпэўнены, што мае выказванні правільна зразумеюць, добра падумаю, перш чым штосьці парэкамендаваць.

— Міхаіл Сямёнавіч, ці бывалі ў вас канфлікты з вучнямі?

— Так, было. З Дзімам Багда-навым здарылася гісторыя, калі я трэніраваў зборную школьнікаў краіны па спартыўным праграмаванні. Ён вельмі хацеў, каб яго сябар таксама трапіў у зборную, і вырашыў менавіта для гэтага выступіць дрэнна. Так і атрымалася. Вось тады мне прыйшлося выказаць свой пункт гледжання: калі мяне не паважаюць як трэнера, я не буду працаваць у такіх умовах. Скончылася тым, што Дзіму «ізалявалі» ад каманды за гэты ўчынак. Сам ён быў упэўнены, што ў любым выпадку трапіць на спаборніцтвы. Тым не менш яму адмовілі. Урэшце ён прынёс прабачэнні, і тады я пайшоў насустрач — зрабіў усё, каб яго вярнуць у каманду. Дрэнна выглядалі і я, і Дзіма. Тым не менш ён тады прывёз «золата». Дарэчы, зараз гэта адзін з самых удзячных маіх вучняў. Мне здаецца, чалавеку выхаванаму ўвогуле лягчэй чагосьці ў жыцці дасягнуць. Мне важна, каб у іх былі нармальныя чалавечыя якасці.

— Вашы вучні могуць атрымаць камп'ютарную залежнасць?

— Залежнасць узнікае звычайна ў гульні, дзе моцныя эмоцыі. А тут яны думаюць, стамляюцца, адпачываюць... Даволі рана дзеці высвятляюць: калі хочаш чаго-небудзь дасягнуць, у цябе не будзе часу на гульні. А калі ты гуляеш, не будзе часу імкнуцца і дасягаць. Я заўсёды імкнуся, каб у вучняў была матывацыя займацца праграмаваннем. Для гэтага існуе табліца вынікаў — дзе ўсе бачаць, як сябры рашаюць задачы. Прыходзілася ў якасці заахвочванняў выкарыстоўваць, напрыклад, тарты — і дзяліць іх прапарцыянальна зробленай колькасці задач... Некаторыя з лепшых ужо школьнікамі атрымліваюць пэўныя прэміі за поспехі — гэта таксама важны стымул, каб займацца далей. Што датычыцца мяне асабіста... Магчыма, можна было б правесці інакш час, які я прысвячаю сваім вучням, але ж не атрымліваецца. Магчыма, гэта самаўдасканаленне, магчыма, цікавая бясконцая спрэчка з самім сабой...

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
Фота аўтара.

г. ВИТЕБСК 06.08.2012

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ С ОДНОВРЕМЕННОЙ ПРОДАЖЕЙ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена предмета аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей
1.	Неиспользуемые здания склада, мастерской, гаража с котельной, расположенные по адресу: Витебская область, г. Полоцк, пер. Тросницкий 5-й, и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объектов недвижимости: **капитальное строение с инв. № 250/С-36182** (корпус 1) (здание специализированное автомобильного транспорта – здание гаража с котельной) одноэтажное кирпичное, 1987 г. постройки, фундамент ж/б, перекрытия ж/б, крыша рулонная, общая площадь 295 кв.м, дом 57/1; **капитальное строение с инв. № 250/С-36186** (корпус 2) (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ – склад) с пристройкой, ограждением, воротами, двумя калитками, одноэтажное кирпичное, 1987 г. постройки, фундамент ж/б, перекрытие ж/б, крыша рулонная совмещенная, общая площадь 604,9 кв.м, дом 57/2; **капитальное строение с инв. № 250/С-36187** (корпус 3) (здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т.ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции) – мастерская) одноэтажное кирпичное, 1987 г. постройки, фундамент ж/б, перекрытие ж/б, крыша рулонная, общая площадь 419 кв.м, дом 57/3. Земельный участок: с кадастровым номером 243500000005001980 для обслуживания зданий склада, мастерской, гаража с котельной, площадь 0,7825 га, сроком аренды 20 лет. Использование – для производственного строительства (реконструкции)	**1 305 048 871**	**261 000 000**

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон в Витебске: (0212) 47 60 96, сайт www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail:votfondgi@tut.by.

ПРОДАВЕЦ НЕДВИЖИМОСТИ: Строительное республиканское унитарное предприятие «Строительно-монтажный трест № 22», тел. (0214) 44 37 55, 41 97 78.

Условия предоставления земельного участка: заключение победителем аукциона договора аренды земельного участка с Полоцким горисполкомом и осуществление государственной регистрации права аренды на земельный участок в двухмесячный срок после получения решения горисполкома о предоставлении ему земельного участка; получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения горисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объектов в срок, не превышающий 2-х лет; осуществление строительства объектов в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

Аукцион состоится 06.08.2012 в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, а также консолидированные участники – два и более субъекта малого предпринимательства – индивидуальные предприниматели и (или) микроорганизации. Участнику необходимо подать заявление и подписать соглашение установленной формы с фондом «Витебскоблимущество».

Лица, желающие принять участие в аукционе, к заявлению прилагают: заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; а также представляются: **юридическими лицами Республики Беларусь** – доверенность, выданная представителю юридического лица, копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования; **индивидуальными предпринимателями** – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; **иностранными юридическими лицами** – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с нотариально удостоверенным переводом на белорусский (русский) язык; **представителем индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность; **представителем иностранного юридического лица** – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык; **иностранным гражданином или лицом без гражданства** – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Консолидированными участниками для участия в аукционе к заявлению прилагаются: оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе; заверенная банком копия платежного поручения о перечислении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении; копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе; сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью.

При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 8.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00, последний день приема документов 03.08.2012 до 17.00 по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. Заключительная регистрация участников 06.08.2012 с 14.00 до 15.00. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

1. Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на **расчетный счет № 3642903027026 в Региональной дирекции № 200 ОАО «БПС-Сбербанк» г. Витебск, БИК 153001369. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495**.

2. Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Аукцион признается несостоявшимся, если заявление на участие подано менее чем двумя участниками, предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

3. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

4. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; не позднее 12 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельного участка.

5. Подробная информация об условиях участия в аукционе и условиях продажи предмета аукциона опубликована ранее в газете «Звязда»: от 15.11.2011 № 217 (27081).

Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи.

ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в д. Черный Лес и агр. Будагово Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области

1.	**Форма проведения аукциона**	Открытый
2.	**Дата, время и место проведения аукциона**	31 июля 2012 года, 15.00, г. Жодино, пер. Молодежный, 3, Жодинский сельисполком, кабинет № 1
3.	**Продавец и его адрес**	Жодинский сельский исполнительный комитет, г. Жодино, пер. Молодежный, 3
4.	**Земельный участок, его кадастровый номер и адрес**	**Лот № 1** — земельный участок площадью 0,2230 га с кадастровым № 624881714801000018 в д. Черный Лес. **Лот № 2** — земельный участок площадью 0,1214 га с кадастровым № 624881714801000019 в д. Черный Лес. **Лот № 3** — земельный участок площадью 0,1390 га с кадастровым № 624881714801000020 в д. Черный Лес. **Лот № 4** — земельный участок площадью 0,1539 га с кадастровым № 624881703101000323 в агр. Будагово, ул. Полевая, 10
5.	**Условия продажи**	Без изменения целевого назначения
6.	**Целевое назначение земельного участка**	Для строительства и обслуживания жилого дома
7.	**Начальная цена продажи**	**Лот № 1** — 20 000 000 рублей **Лот № 2** — 11 000 000 рублей **Лот № 3** — 13 000 000 рублей **Лот № 4** — 20 000 000 рублей
8.	**Условия аукциона**	Участниками аукциона могут быть граждане республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь
9.	**Наличие инженерной инфраструктуры**	**Лот № 1, Лот № 2, Лот № 3** (электроснабжение) **Лот № 4** (газоснабжение, электроснабжение)
10.	**Сумма задатка и реквизиты продавца**	10% от начальной цены земельного участка, р/с 3604627020009 в филиале № 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, ул. 50 лет Октября, 25 «А», код 812, УНП 600023532 (с пометкой «задаток за земельный аукцион»)
11.	**Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками**	Каждый четверг в 15.00
12.	**Окончательный срок приема заявлений**	25 июля 2012 года до 17.00
13.	**Контактные телефоны**	8 01775 35 449, 8 01775 37 174, 8 01775 37 189

Расходы по организации и проведению аукциона (Лот № 1 — 970 847 рублей; Лот № 2 — 970 847 рублей; Лот № 3 — 970 847 рублей; Лот № 4 — 1 603 848 рублей) **и затраты на публикацию информационного сообщения** подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.

2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.

3. Документ (копию), удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо).

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ Гродненского облпотребобщества (Сморгонский филиал)

Организатор аукциона: Частное унитарное предприятие «Научно-производственный центр Белкоопсоюза» (далее по тексту — ЧУП «НПЦ Белкоопсоюза»), г. Минск, пр-т Победителей, 17, 1001. Тел. (029) 318 37 22, (017) 226 99 92, (017) 226 91 19, (017) 226 99 22.

Аукцион проводится 07 августа 2012 г. в 12 часов 00 минут по адресу: Гродненская обл., г. Сморгонь, ул. Чапаева, 3

в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества организаций потребительской кооперации, собственником которого является Белкоопсоюз.

ЛОТ № 1. Котельная с пристройкой, инв. № 443/С-18168, общей площадью 271,6 кв.м. Материал стен — кирпич. Фундамент — бетонированный. Перегородки — кирпичные. Крыша — рулонная. Полы — плитка, бетон.

Объект расположен на земельном участке площадью 0,2624 га с кадастровым номером 425650100001004012 по адресу: Гродненская обл., г. Сморгонь, ул. Железнодорожная, 10А.

Начальная цена продажи — 148 233 000 (сто сорок восемь миллионов двести тридцать три тысячи) рублей без НДС.

Сумма задатка — 14 823 300 (четырнадцать миллионов восемьсот двадцать три тысячи триста) рублей.

Условия продажи — нет.

ЛОТ № 2 (в комплексе):

Склад МТС (с ограждением), площадью 1681,3 кв.м, инв. № 443/С-18188. Материал стен — панели, кирпич. Фундамент — ленточный из сборных бетонных блоков. Перегородки — кирпичные. Крыша — двухскатная, асбестоцементные листы. Полы — бетонные, плитка, линолеум, ДВП. Объект торгов обременен договором на аренду (часть здания), действует по 20.01.2013. Материал ограждения — ж/бетонные плиты в бетонных столбах, блоки, кирпич, панели газосиликатные, дощатый.

Склад металлический, площадью 141,8 кв.м, инв. № 443/С-18189. Материал стен — металл. Фундамент — металлические столбы. Перегородки — металл. Крыша — односкатная совмещенная, листы асбоцементные. Полы — бетон.

Склад металлический, площадью 156,2 кв.м, инв. № 443/С-18190. Материал стен — металл. Фундамент — металлические столбы. Перегородки — металл. Крыша — односкатная совмещенная, листы асбоцементные. Полы — бетон.

Склад блочный, площадью 22,6 кв.м, инв. № 443/С-18191. Материал стен — газосиликатные блоки. Фундамент — ленточный бетонный. Перегородки — газосиликатные блоки. Крыша — листы асбоцементные. Полы — нет.

Склад металлический, площадью 244,6 кв.м, инв. № 443/С-18192. Материал стен — металл. Фундамент — металлические столбы. Перегородки — металл. Крыша — односкатная совмещенная, листы асбоцементные. Полы — бетон.

Склад металлический, площадью 145,7 кв.м, инв. № 443/С-18193. Материал стен — металл. Фундамент — металлические столбы. Перегородки — металл. Крыша — односкатная совмещенная, листы асбоцементные. Полы — бетон.

Склад блочный, площадью 76,4 кв.м, инв. № 443/С-18194. Материал стен — ячеистые блоки. Фундамент — ленточный бетонный. Перегородки — мелкие газосиликатные блоки. Крыша — листы асбоцементные. Полы — бетон.

Объекты расположены на земельном участке площадью 0,678 га, с кадастровым номером 425650100001004159 по адресу: Гродненская обл., г. Сморгонь, ул. Железнодорожная, 18, 18/1, 18/2, 18/3, 18/4, 18/5, 18/6 соответственно.

Начальная цена продажи — 343 594 000 (триста сорок три миллиона пятьсот девяносто четыре тысячи) рублей без НДС.

Сумма задатка — 34 359 400 (тридцать четыре миллиона триста пятьдесят девять тысяч четыреста) рублей.

Условия продажи — нет.

Задаток перечисляется ЧУП «НПЦ Белкоопсоюза», р/с 3015201080017, УНН 100060419 ОКПО 14586268, ф-л МГД ОАО «Белагрепромбанк» г. Минска, код 963.

Срок и условия оплаты за объекты: определяются по согласованию победителя торгов с собственником имущества при заключении договора купли-продажи.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 17, каб. 1004а, 1001, с 8.30 до 12.30 и с 13.30 до 17.30 в рабочие дни. Прием документов заканчивается в 17 часов 30 минут 3 августа 2012 г.

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о перечислении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в Извещении;

индивидуальными предпринимателями — резидентами Республики Беларусь — копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии;

юридическими лицами — резидентами Республики Беларусь — копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица, копия устава (учредительного договора — для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии;

индивидуальными предпринимателями — нерезидентами Республики Беларусь — легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

юридическими лицами — нерезидентами Республики Беларусь — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть оформлена не ранее чем за шесть месяцев до даты подачи заявления) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица — также документ, подтверждающий его полномочия.

Представителем заявителя (кроме случая, когда юридическое лицо представляет его руководитель) предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости (для представителя иностранного юридического лица) легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

Сведения о продавце: Гродненское областное потребительское общество, 230023, г. Гродно, ул. 1 Мая, 28.

Дополнительную информацию о предмете торгов можно получить в Сморгонском филиале Гродненского облпотребобщества, 231000 Гродненская обл., г. Сморгонь, ул. Чапаева, 3, тел.: (029) 166 61 90, (015 92) 21184, 31317.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты, связанные с организацией и проведением аукциона. После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) названных платежей продавец заключает с ним договор купли-продажи предмета аукциона в течение 10 календарных дней со дня проведения аукциона.

г. ВИТЕБСК 20.08.2012

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ НА АУКЦИОНЕ С ПРИМЕНЕНИЕМ В ХОДЕ ТОРГОВ МЕТОДА ПОНИЖЕНИЯ НАЧАЛЬНОЙ ЦЕНЫ ПРОДАЖИ

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена продажи предмета аукциона, рублей	Минимальная цена продажи предмета аукциона, рублей	Сумма задатка за участие в торгах, рублей
1.	Здание бывшего пункта централизованного наблюдения, расположенное по адресу: Витебская обл., Миорский р-н, г. Дисна, ул. Советская,10.	Характеристика объекта недвижимости: капитальное строение с инв. № 211/С-8654 (здание неустановленного назначения – пункт централизованного наблюдения), одноэтажное кирпичное, 1987 г. постройки, общая площадь 36,7 кв.м, объём 152 куб.м, фундамент б/бетонный, перекрытие ж/бетонное, крыша а/волнистая. Земельный участок с кадастровым номером 223351000001000037, площадь 0,0133 га для размещения административного здания, срок аренды 50 лет.	25 923 582	5 184 716	8 240 160
